

# «МЫ ПОЎНЫЯ РАШУЧАСЦІ АДСТАЯЦЬ СВАЕ ІНТАРЭСЫ»

**Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін правялі сустрэчу на востраве Валаам у Карэліі**

(Стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

2 ЖНІЎНЯ 2025 г. СУБОТА № 147 (30535)

# МЕДЫКІ З НОВАГА ПАПАЎНЕННЯ




## Учора больш за 10 тысяч маладых урачоў і медсясцёр прыступілі да работы

З 1 жніўня ў бальніцы, паліклінікі, урачэбныя амбулаторыі і ФАПы па размеркаванні прыбылі каля 2450 выпускнікоў медыцынскіх універсітэтаў, якія працуюць урачамі-інтэрнамі, прыкладна 4000 спецыялістаў з сярэдняй медыцынскай адукацыяй і каля 2,2 тысячы ўрачоў, якія прайшлі інтэрнатуру. Больш за палову выпускнікоў медыцынскіх ВНУ адправіліся ў цэнтральныя раённыя бальніцы, аптэкі і іншыя арганізацыі аховы здароўя, у тым ліку ў сельскай мясцовасці. 40 % урачоў-інтэрнаў накіруюцца ў сталічныя і абласныя медыцынскія ўстановы. Трыццаць чалавек з банка адоранай моладзі размеркаваны ў рэспубліканскія навукова-практычныя цэнтры.

СТАР. 11

Фота БелТА.

ЖНІВО ВЯДЗЕЦЦА АКТЫЎНЫМІ ТЭМПАМІ



4–5

СЕЗОННЫ КЛОПАТ

# РАДЫ ДАПАМАГЧЫ!

**Расказваем, як адна асобна ўзятая школа рыхтуецца да новага навучальнага года і як у гэтым удзельнічаюць вучні і іх бацькі**

Ужо зусім хутка школьнікі Беларусі сядуць за вучэбныя парты і пачнуць захапляльнае падарожжа па свеце ведаў. Школы ва ўсю рыхтуюцца да новага навучальнага года: праводзяць рамонт, закупляюць мэблю, абсталяванне, выконваюць генеральныя ўборкі. Уласны карэспандэнт «Звязды» адправілася ў гродзенскую сярэднюю школу № 41 імя А. М. Кузняцова, каб паглядзець, як там рыхтуюцца да першага верасня.



СТАР. 8-9

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

25147>

9 771990 763008

## Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін правялі сустрэчу на востраве Валаам у Карэліі

# «МЫ ПОЎНЫЯ

Прэзідэнт Беларусі знаходзіцца з рабочым візітам у Расіі. У фармаце «адзін на адзін» кіраўнікі дзяржаў у нефармальнай абстаноўцы абмеркавалі найбольш важныя і актуальныя пытанні, звязаныя з развіццём беларуска-расійскіх адносін, рэалізацыяй саюзных праектаў. Таксама ў цэнтры ўвагі двух лідараў — міжнародны парадак дня і тэматыка рэгіянальнай бяспекі.


president.gov.by

Уладзімір Пуцін сустрэў беларускага калегу каля ўваходу ў Смаленскі скіт Валаамскага манастыра. Прэзідэнты цёпла прывіталі адзін аднаго. «У патрэбны час, у патрэбным месцы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнты наведалі Храм Смаленскай іконы Божай Маці, дзе адбыўся кароткі малебен. Аляксандр Лукашэнка прапанаваў пабудаваць у Валаамскім манастыры беларускі храм.

«Так, калі ласка. З задавальненнем», — адказаў Прэзідэнт Расіі.

### «НІКОМУ НЕ ЎДАСЦА ПАСТАВІЦЬ НАС НА КАЛЕНІ»

***На Валааме Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін пагутарылі з журналістамі.***

Кіраўнікоў дзяржаў спыталі пра санкцыйны ціск Захаду і захады ў сувязі з гэтым. «Калі перад намі зачыніў нехта дзверы — у свеце вельмі шмат адчыненых дзвярэй, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — І Расія, і Беларусь сёння зрабілі вельмі сур'ёзны разварот. Час пройдзе, свет яшчэ ацэніць тое, што зроблена намі. Жывём і будзем жыць. У нашым свеце нікому не ўдасца паставіць нас на калені. Мы поўныя рашучасці адстаяць свае інтарэсы».

Прэзідэнт падкрэсліў, што Расія — гэта скарбніца карысных выкапняў і тэхналогій. Аднак патрэбны час, каб канчаткова ўсім, хто сумняваецца, даказаць, што краіны разам здольныя на многае.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што на сваёй нядаўняй сустрэчы з беларускімі дыпламатамі сказаў, што санкцый няма і няма чаго пра іх гаварыць. «Санкцыі — гэта магчымасці. Думаю, і ў Расіі дакладна так, яшчэ больш вострa разумеюцы гэта пытанне, дзейнічаюць. Мы пабач заўсёды былі і будзем. Не хвалюйцеся за гэтыя санкцыі», — сказаў Прэзідэнт.

Ён зноў заклікаў Еўрасаюз адысці ад канфрантацыі і супрацоўнічаць з Расіяй. «Ім бы трэба было не цягацца з намі лоб у лоб, а разам быць, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Еўрапейскі саюз і Расія. Вось гэта моц, калі б аб'ядналіся... Вядома, ніколі, напэўна, амерыканцы не змогуць такога дапусціць. Гэта страшна для іх. Гэта страшней, чым Кітай, было б. Калі б аб'яднаць, гэта была б сіла. Яны (палітыкі ў ЕС. — **«Зв.»**) гэта не разумеюць. Ды ім, напэўна, і не трэба. Я ўжо гляджу на гэтых лідараў... Некаторыя ўжо сыходзяць. Як іх называюць, кульгавыя качкі. Іншыя толькі прыйшлі, і ўжо ніжэй за 20 % рэйтынг. Народам не падабаецца гэта палітыка».

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, народы ў ЕС не падтрымліваюць палітыку, якая там праводзіцца, у тым ліку ў адносінах да Украіны, і вялікіх выдаткаў на ўзбраенне на фоне зніжэння ўзроўню жыцця: «Самі галеюць, а вялізныя мільярды, да трыльёнаў — узбраенне і дапамога Украіне. Напэўна, гэта няправільна».

Каменціруючы нядаўняе гандлёвае пагадненне паміж ЗША і Еўрасаюзам, Аляксандр Лукашэнка падзяліў меркаванне расійскага кіраўніцтва, што гэта прывядзе да дэіндустрыялізацыі Еўропы. «Хоць гэта ўжо адбываецца ў іх, і працягваецца гэты працэс. Знішчаць Еўропу, Еўрапейскі саюз. Неяк пагаворвалі, што такая мэта ў амерыканцаў таксама ёсць — аслабіць гэты цэнтр сілы (усё ж такі Еўрапейскі саюз — не слабая была арганізацыя). Ну, вось гэта і адбудзецца», — адзначыў Прэзідэнт.

### «НЯМА ТАКОЙ НЕАБХОДНАСЦІ БЕГЧЫ НА АПЯРЭДЖАННЕ»

Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін пацвердзілі планы па пастаўцы ракетнага комплексу «Арэшнік» у Беларусь да канца года.

«Канкрэтыка ў тым, што ваенныя, хоць яны людзі канкрэтныя і ўсюды спяшаюцца, хацелі гэты «Арэшнік» (беларускую пазіцыю) размясціць недзе ў будучым годзе, — сказаў беларускі лідар. — Уладзімір Уладзіміравіч прама сказаў: «Сёлета мы ў асноўным павінны закончыць гэтыя працэсы — будаўніцтва, стварэнне і гэтак далей. Мы ад гэтага не адступаем пакуль?»

«Не, — пацвердзіў Уладзімір Пуцін. — У нас выраблены першы серыйны комплекс «Арэшнік». Першая серыйная ракета. І яна паступіла ў войскі. Цяпер серыя запушчана».

Прэзідэнт Расіі таксама паведаміў, што беларускія і расійскія ваенныя спецыялісты выбралі месца для будучых пазіцый, цяпер ідзе работа па іх падрыхтоўцы. «Так што, хутчэй за ўсё, мы да канца года гэта пытанне закрыем», — заявіў Уладзімір Пуцін.

«Мы робім спакойна. Няма такой неабходнасці бегчы на апярэджанне», — дадаў Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што пазіцыі пабудаваць дастаткова проста, але трэба рэалізаваць і іншыя мерапрыемствы, у тым ліку абараніць гэтыя пазіцыі.

# ЭКАНАМІЧНЫ СУВЕРЭНІТЭТ

## «Дыпламатыя як аснова нацыянальнай бяспекі»: эксперты — аб выніках нарады

Ва ўмовах глабальных эканамічных змяненняў і нестабільнасці задача, пастаўленая Прэзідэнтам па нарошчванні экспарту і прыцягненні новых інвестыцыйных праектаў, становіцца ключавой для дыпламатычнага корпуса і айчынных вытворцаў. Гэта не проста эканамічная мэта, але і стратэгічная неабходнасць, накіраваная на ўмацаванне суверэнітэту і незалежнасці краіны. Нездарма гэта стала асноўнай тэмай нарады ў Палацы Незалежнасці з дыпламатычным корпусам. Вынікі нарады абмеркавалі з экспертамі. Падрабязнасці — у нашым матэрыяле.

### СТАЎКА — НА РАЗВІЦЦЁ АДНОСІН

**Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Сяргей РАЧКОЎ** у эфіры «Першага інфармацыйнага» падзяліўся ўражаннямі і думкамі пасля ўдзелу ў нарадзе Прэзідэнта з кіраўнікамі дыпламатычных прадстаўніцтваў Беларусі, якая адбылася напярэдадні.

Ён нагадаў, што апошняя сустрэча беларускага лідара з кіраўнікамі дыпламатычных прадстаўніцтваў прайшла ў 2021 годзе:

— Шмат што пасля гэтага змянілася і ў свеце, і ў краіне. Мы ажыццявілі палітычную мадэрнізацыю нашай сістэмы. І вельмі важна было пачуць ад Прэзідэнта яго ацэнкі, арыенціры. І сапраўды, Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка правёў глыбокую размову з удзельнікамі нарады. Для мяне яшчэ больш стала зразумела, што ў такіх няпростых умовах, калі Беларусь захавала і мір, і бяспеку, і паступальнае эканамічнае развіццё, неабходна гэта шанаваць і прыкладаць яшчэ больш намаганняў, каб гэта прымножыць.

На нарадзе размова ішла, у прыватнасці, аб узаемаадносінах Беларусі з іншымі краінамі, аб шматвектарнасці беларускай палітыкі. З гэтай нагоды Сяргей Рачкоў адзначыў:

— Сапраўды, мы сёння робім стаўку на развіццё адносін з Расіяй, Кітайскай Народнай Рэспублікай, Індыяй, іншымі членамі БРІКС і ШАС. Але мы не павінны забываць, што ў нас ёсць еўрапейскія суседзі. Таму Прэзідэнт акцэнтаваў увагу на тым, што нам неабходна працаваць з нашымі суседзямі, з еўрапейцамі. Гэта важна для нашай краіны. І ў гэтым заключаецца шматвектарнасць беларускай знешняй палітыкі.

Парламентарый асабліва падкрэсліў:

— Але перш за ўсё мы не працуем супраць кагосьці, мы працуем і рэалізоўваем нацыянальныя інтарэсы Рэспублікі Беларусь, а яны знаходзяцца ў тым ліку ў краінах Лацінскай Амерыкі, Азіі і Афрыкі.

Так, шматвектарнасць з'яўляецца асновай здаровай знешняй палітыкі для любой дзяржавы. Такую думку ў эфіры ток-шоу «Будні» на «Альфа Радыё» пацвердзіў **палітолаг Вадзім БАРАВІК**.

Госць праграмы адзначыў, што гнуткі, разумны падыход кіраўніка дзяржавы да знешняй палітыкі ўратаваў беларусаў ад многіх бед:

— Гэта разумная пазіцыя. Папрокі некаторых экспертаў, палітыкаў у тым, што мы праводзім шматвектарную палітыку і нібыта спрабуем здрадзіць тым ці іншым саюзнікам, недарэчныя. Шматвектарнасць — аснова здаровай знешняй палітыкі для любой дзяржавы. Любая краіна зацікаўлена ў гандлі і ўзаемадзеянні з усімі дзяржавамі свету.

Беларуская эканоміка кампактная, і гэта наша перавага, дадаў палітолаг:

— Сёння мы зацікаўлены ў аднаўленні гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва з Еўрапейскім саюзам, але ёсць нюансы — будзем у гэтым напрамку працаваць. Добра працавалі ў Расіі, але таксама ёсць нюансы. У Кітаі істотна павялічылі наш экспарт сёлета. Пекін нам больш прадае, але тым не менш мы на гэтым рынку расцём. Мы павінны асвойваць рынак Афрыкі. Пакуль, можа, ён не так хутка развіваецца. Аднак калі мы замацуем месца і будзем мець добрыя паказчыкі, з году ў год іх нарошчваць, то атрымаем добрыя перспектывы на рынку, які мае патэнцыял выбуховага росту.

Акрамя традыцыйных рынкаў, дзе Беларусь прысутнічала, мы зацікаўлены і на захад вярнуцца, і краіны далёкай дугі асвоіць, падсумаваў Вадзім Баравік.

### ПРЫЯРЫТЭТЫ НА ЗНЕШНІМ КОНТУРЫ

Сучасная Беларусь — краіна з устойлівым суверэнітэтам, дзяржава, здольная захаваць мір і эканамічнае развіццё ў самых складаных умовах. Такую выснову, на думку **члена Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Людмілы САПЕГА**, можна зрабіць па выніках праведзенай нарады ў Палацы Незалежнасці.

— Сённяшняя Беларусь, паводле слоў Прэзідэнта, — гэта сярэдняя па еўрапейскіх мерках краіна з адкрытай, арыентаванай на экспарт эканомікай. Таму асноўнымі прыярытэтамі на знешнепалітычным контуры павінны быць нарошчванне і эфектыўнасць знешняга гандлю. І ніякія спасылкі на эканамічныя санкцыі і палітычны ціск не могуць служыць апраўданнем нізкай якасці работы на гэтым кірунку, — падкрэсліла сенатар.

Яна прывяла тэзіс Прэзідэнта аб тым, што няма выніку — дыпламатаў там няма:

# РАШУЧАСЦІ АДСТАЯЦЬ СВАЕ ІНТАРЭСЫ»

«Усё па плане ў нас», — падкрэсліў Уладзімір Пуцін.

Рэзюмуючы, Аляксандр Лукашэнка заклікаў не перажываць за бяспеку.

## «ТРЭБА САДЗІЦЦА ЗА СТОЛ ПЕРАГАВОРАЎ І РАЗМАЎЛЯЦЬ»

Адказваючы на пытанне аб магчымым падключэнні Беларусі да перагаворнага працэсу па Украіне, кіраўнік дзяржавы сказаў: «Мы даўно дамовіліся з Уладзімірам Уладзіміравічам. Калі трэба, ён заўсёды скажа, падключыць Беларусь. І да працэсу, і да працэсаў».

Прэзідэнт таксама нагадаў, што Беларусь ужо ўдзельнічае ў рэалізацыі мірных дамоўленасцяў, ажыццяўляючы тое, што было дасягнута на перагаворах паміж Расіяй і Украінай у Стамбуле. Размова перш за ўсё аб забеспячэнні працэсу абмену ваеннапалоннымі і целамі загінулых.

«У Стамбуле дамовіліся. Важныя пытанні: абмен ваеннапалоннымі, параненымі і іншае-іншае... Я тэлефанаваў Уладзіміру Уладзіміравічу і расказваў, што мы адналькава да ўсіх ставімся. Ён гэта падтрымлівае. Людзі — і ўкраінцы, і расіяне — яны ж воіны. Хтосьці паранены, хтосьці яшчэ нешта... Усіх жадаючых мы ў бальніцу адразу, калі тэрмінова трэба аказаць дапамогу. А такія людзі ёсць», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

Пры гэтым размова ідзе не толькі пра абмен ваеннапалоннымі, але і пра перадачу цел загінулых ваеннаслужачых. Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, у гэтым пытанні ўкраінцы давяраюць толькі беларусам. «Нас папрасілі расіяне, украінцы. Пагадзіліся з гэтым. Мы гэта робім. Трэба будзе — працягнуць яшчэ», — сказаў ён.

Уладзімір Пуцін нагадаў, што мірныя перагаворы па Украіне пачыналіся менавіта ў Беларусі.

«Так, тры раўнды прайшлі. Не падабаецца ў Беларусі — ну добра. Мы з Уладзіміравічам абмяркоўвалі — ды хоць на Месяц, куды заўгодна. Але трэба садзіцца за стол перагавораў і размаўляць, а не кідаць камяні адзін у аднаго», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка таксама падкрэсліў, што не трэба крычаць: «Я хачу сустрэцца з Пуціным!» «Ну чаго ты крычыш пра гэта? Падрыхтуйце адпаведную глебу, заявы і іншае. Амерыканцам пра гэта казаў. Падрыхтуйце, а потым садзіцеся і падпісвайце. І Трампа клічце, Макрона, каго заўгодна, Стармера... Але трэба ж падрыхтаваць гэта. Што, яны не разумеюць? Разумеюць. А калі так заяўляюць, значыць, не хочуць. Проста на публіку (робяць заявы. — **«Зв.»**)».

Кіраўнік дзяржавы запэўніў, што абсалютна падтрымлівае Прэзідэнта Расіі ў яго падыходах наконт перагавораў. «Вайна вайной, але перагаворы вядуцца заўсёды. Амерыканцы ваявалі ў В'етнаме за трыдзевяць зямель і з першага дня вайны вялі перагаворы», — нагадаў беларускі лідар.

У гэтым плане Аляксандр Лукашэнка ўказаў на памылку ўкраінскага боку: «Яны патрабуюць немагчымага. Тое, што яны гавораць, і тое, што прапаноўвае Расія, — гэта за сталом перагавораў вырашаецца. Там могуць (быць. — **«Зв.»**) кампрамісы, адступленні, павароты, развароты. А вось так у лоб — гэта на публіку. Гэта да таго, што «мы гаворым шмат, а рабіць нічога не хочам».

Беларусь у сваю чаргу таксама робіць унёсак у мірны працэс, спрыяючы абменам на мяжы паміж Расіяй і Украінай: «Тое, што расіяне дамаўляюцца ў Стамбуле з украінцамі (Уладзімір Уладзіміравіч, памятаеце, тэлефанаваў мне, дзякаваў), — працяг у Беларусі. Мы ўсё робім — абмены гэтыя на граніцы».

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што ўкраінцы для гэтых абменаў адкрылі ўчастак граніцы, аднавілі на патрэбнай тэрыторыі чыгуначныя зносіны. «Значыць, зрухі ёсць», — канстатаваў беларускі лідар.

«Пра дзяцей шмат крычалі. Калі ласка, расіяне гавораць, прыязджайце, глядзіце. Вядуцца перагаворы ўпаўнаважанымі па правах чалавека Расіі і Украіны, па дзетках вядуцца перагаворы, — удакладніў Прэзідэнт Беларусі. — Што Расія зрабіла дрэннага? Ідзе вайна, дзеці засталіся бездаглядныя. Пакармілі, апранулі. Не, іх у гэтым абвінавацілі. За што? Калі ласка, давайце дамаўляцца. І абмен ідзе».

«Мы вельмі ўдзячныя Аляксандру Рыгоравічу і наогул Беларусі за тую падтрымку, дапамогу, якую нам аказваюць (у перагаворным працэсе. — **«Зв.»**). Мы ў кантакце пастаянна. Я пастаянна інфармую Аляксандра Рыгоравіча аб выніках перагавораў. Усе абмены ў нас адбываюцца на тэрыторыі Беларусі. Там пачаўся перагаворны працэс у 2022 годзе. Затым перабраўся ў Стамбул», — адзначыў Уладзімір Пуцін.

Расійскі лідар заўважыў, што яму добра вядома пазіцыя беларускага калегі і ўсяго беларускага народа, які імкнецца да таго, каб паміж Расіяй і Украінай хутчэй наступіў мір: «Аляксандр Рыгоравіч прымае ў гэтым прамы, непасрэдны ўдзел».

## «НАМ ТРЭБА СПЫНЯЦЬ ГЭТА. І РАБІЦЬ ГЭТА ТРЭБА АКУРАТНА»

Каменціруючы заявы кіраўніка ЗША наконт дэдлайнаў, Прэзідэнт Беларусі сказаў: «50, 60, 10 дзён. Так палітыка не робіцца. Калі ён міру хоча, ён павінен падключацца акуратна, грунтоўна. Гэта ваеннае сутыкненне. І ўказваць там не атрымаецца. Тым больш ядзернай дзяржаве. Гэта проста смех выклікае».

Аляксандр Лукашэнка назваў Дональда Трампа «нашым агульным сябрам, за якога мы гэта перажывалі». «Я памятаю нашы перажыванні, каб ён перамог і гэтак далей», — удакладніў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы нагадаў пра сваю нядаўнюю сустрэчу з амерыканцамі. «Я ім адкрыта гэта сказаў. Гэта яго (Дональда Трампа. — **«Зв.»**) блізкія сябры. Вы, кажу, прэзідэнту скажыце, што трэба акуратна гэта ўсё рабіць. І можна дамовіцца», — расказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт расказаў пра прапанову, якая гучала раней, аб паветраным перамір'і, гэта тэма закраналася і на яго сустрэчы з прадстаўнікамі ЗША: «Я кажу: Расія ў гэтым зацікаўлена і Прэзідэнт Пуцін. Але вы ж гэтага не хочаце. Скажыце Зяленскаму, няхай на гэта ідзе, каб не было ўсіх гэтых лётаючых апаратаў і на галаву людзям не падалі».

У кантэксце неабходнасці больш хуткага ўрэгулявання канфлікту ва Украіне кіраўнік дзяржавы згадаў пра беспілотнік, які ўпаў нядаўна ў Беларусі. «59 кілаграм узрыўчаткі, начынены шарыкамі і іншае. Ну добра, не ўзарваўся. Ударыў па 10-павярховым доме, дзе жылі звычайныя людзі. Таму небяспечная вось гэта эскалацыя. Нам трэба спыняць гэта. І рабіць гэта трэба акуратна», — падкрэсліў беларускі лідар.

## «ГЭТА ЧАХАРДА, ІНАКШ НЕ НАЗАВЕШ»

Адно з пытанняў, якія журналісты задалі лідарам дзвюх краін, датычылася антыкарупцыйных украінскіх ведамстваў — Нацыянальнага антыкарупцыйнага бюро Украіны (НАБУ) і Спецыялізаванай антыкарупцыйнай пракуратуры (САП). У канцы ліпеня Уладзімір Зяленскі падпісаў закон, які пазбаўляе гэтыя органы незалежнасці. Але ўжо праз два дні пасля таго, як Рада адобрыла адпаведны дакумент, антыкарупцыйным органам вярнулі незалежнасць.

«Захад цяпер цісне на Зяленскага. І я вось назіраю за гэтым, думаю: ну а што Зяленскі хацеў? Ён мільярды і сотні мільярдаў узяў грошай. Захад гаворыць: мы хочам паглядзець, куды гэтыя грошы будуць трацішча. І прапанавалі калісьці стварыць антыкарупцыйнае бюро і антыкарупцыйную пракуратуру», — нагадаў Аляксандр Лукашэнка.

Такім чынам, растлумачыў беларускі лідар, Захад, які выдзяляў грошы Украіне, хацеў пракантраляваць, куды гэтыя сродкі будуць накіраваныя. «Абуракца не трэба. Ты (Уладзімір Зяленскі. — **«Зв.»**) узяў грошы, і той, хто даваў, хацеў праканраляваць у цябе як несуверэннай дзяржавы, куды ты іх дзеў. А куды падзеў, вы ведаеце, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — За гэты час людзі на Лазурным беразе і яшчэ далей пабудавалі палацы і нядрэнна сябе адчуваюць. І нават у прэзідэнты Украіны некаторыя мецяць. Гэта чахарда, інакш не назавеш».

**Паводле БелТА.**

# І ШМАТВЕКТАРНАСЦЬ

## ў Палацы Незалежнасці з дыпламатычным корпусам

— Любую чарговую забарону з боку таго ж ЕС неабходна разглядаць выключна як магчымасць рэалізацыі айчыннай прадукцыі ў іншых рэгіёнах: у Афрыцы, у Азіі, у Лацінскай Амерыцы. Гэта не зусім чужыя нам краіны. У многіх краінах Афрыкі, напрыклад, трактары «Беларус» і іншую прадукцыю беларускіх вытворцаў ведаюць яшчэ з савецкіх часоў.

Эксперт нагадала, што многія лідары гэтых дзяржаў у свой час вучыліся ў савецкіх, у тым ліку беларускіх ВНУ:

— І яны выдатна дасведчаныя, што беларусы заўсёды цвёрда выконваюць свае абавязацельствы, ніколі не блытаючы эканоміку з палітыкай. Таму абсалютна мае рацыю Аляксандр Лукашэнка, калі нават пад ціскам з боку турбапатрыётаў не адмаўляецца ад палітыкі шматвектарнасці. Найперш у эканоміцы.

Галоўная задача, перакананая сенатар, скарыстацца любым шанцам і цвёрда стаяць на абароне інтарэсаў Беларусі.

— Што немагчыма зрабіць без падтрымкі з боку Расіі — краіны, дзе пражывае найбольш блізкі нам ментальна і гістарычна народ. Вопыт апошніх гадоў наглядна дэманструе: чым больш цесныя нашы эканамічныя сувязі з Расійскай Федэрацыяй, тым больш моцныя і непарушныя наш рэальны суверэнітэт і незалежнасць, — падкрэслівае парламентарый.

З дадзеным тэзісам салідарны **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, энергетыцы, транспарце, сувязі і лічбавым развіцці Уладзімір БАРАВЕНКА**:

— Узаемадзеянне з Расіяй у рамках Саюзнай дзяржавы пастаянна пашыраецца. Для гэтага парламентам ствараецца надзейная заканадаўчая база. Толькі за апошні год Палатай прадстаўнікоў ратыфікаваны пагадненні аб роўных правах грамадзян, трансгранічным электронным узаемадзеянні і прызнанні электроннага лічбавага подпісу, забеспячэнні паралельнай работы энергасістэм, у галіне нацыянальнай бяспекі і многія іншыя.

Суразмоўца дадаў, што беларускія і расійскія парламентарыі неаднаразова ўзаемадзейнічалі ў рамках Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, абмяркоўваючы актуальныя пытанні супрацоўніцтва дзвюх дзяржаў, мадэльныя законы:

— Тым самым ствараецца магчымасць для цеснай сумеснай работы ў эканамічнай, палітычнай і ваеннай сферах. І яе вынікі — рэальныя: прырост экспарту за тры гады склаў плюс 10 мільярдаў рублёў.

Уладзімір Баравенка нагадаў тэзіс кіраўніка дзяржавы аб тым, што «для нас Расія — гарант нашай бяспекі»:

— Таму аб'ёмы двухбаковага супрацоўніцтва ў найбліжэйшыя гады на ўсіх узроўнях — парламенцкім, урадавым і рэгіянальным — будуць толькі нарастаць.

## ЭКАНОМІКА — КРАЕВУГОЛЬНЫ КАМЕНЬ

На думку **члена Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Аляксандра КАРПІЦКАГА**, пастаўленыя кіраўніком дзяржавы задачы — не проста рабочыя арыенціры, а стратэгічны імператыў ва ўмовах глабальнай турбулентнасці:

— Як падкрэсліў Прэзідэнт, «эканоміка — краевугольны камень» нашай дзяржавы. Для Беларусі, краіны з адкрытай экспартна арыентаванай мадэллю, нарошчванне знешняга гандлю і прыцягненне інвестыцый — пытанне выжывання.

Сенатар нагадаў, што санкцыі ЕС (а з 2020 года было ўведзена 18 пакетаў) не зламалі эканоміку: у 2024-м экспарт тавараў і паслуг дасягнуў 50 мільярдаў долараў:

— Задача дыпламатаў — перавесці 14 мільярдаў долараў са страчаных рынкаў (ЕС, Украіна) на новыя напрамкі, выкарыстоўваючы прынцып: «Увеў ЕС забарону — вось вам аб'ёмы для іншых рэгіёнаў!»

У якасці прыкладу — поспехі такіх прадпрыемстваў, як «Гомсельмаш», МАЗ, БМЗ, якія даказваюць эфектыўнасць пераарыентацыі: 85 % тэхнікі «Гомсельмаша» ідзе ў Расію, а БМЗ нарасціў пастаўкі металапрадукцыі ў Азію.

Таксама сенатар звяртае ўвагу на тое, як Прэзідэнт спыніў спекуляцыі аб «акупацыі» Беларусі: «Мы — суверэнная дзяржава. Нічога падобнага няма і быць не можа».

— Ваенна-палітычны саюз з Расіяй — усвядомлены выбар, які гарантуе бяспеку, — падкрэслівае суразмоўца і нагадвае, што падтрымка Масквы ў 2020 годзе і пастаўкі ўзбраення прадухілілі адкрытую канфрантацыю з НАТА.

Працягваючы тэму, сенатар пракаментаваў тэзіс Прэзідэнта аб тым, што дыпламаты — «людзі ваенныя» ва ўмовах «мірнага часу, які патрабуе ваеннай мабілізацыі»:

— Іх абавязак — бездакорна адстойваць нацыянальныя інтарэсы.

Прыярытэт гэтай работы — у сінергіі традыцыйных саюзаў (Расія, Кітай) і новых рынкаў:

— Расія застаецца ключавым партнёрам, Азія, Афрыка, Лацінская Амерыка — новыя пункты росту.

Пры гэтым у адносінах з Захадам, падкрэслівае суразмоўца, застаецца пэўны прагматызм:

— Нягледзячы на санкцыі, разрыў стасункаў недапушчальны — «суседзі ёсць суседзі, іх не выбіраюць». Важна выкарыстоўваць раскол у ЕС (напрыклад, па міграцыйнай палітыцы).

У заключэнне парламентарый адзначыў, што 2025—2026 гады стануць перыядам і выпрабаваннем, і магчымасцю:

— Поспех залежыць ад згуртаванасці дыпламатычнага корпуса, які павінен працаваць як злажданы механізм: жорстка — у адстойванні суверэнітэту, гнутка — у пошуку рынкаў, нястомна — у прыцягненні інвестыцый. Як сказаў Прэзідэнт: «Дыпламаты — таксама людзі ваенныя». Іх зброя — эканамічная эфектыўнасць, а шчыт — бескампрамісная абарона нацыянальных інтарэсаў.

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ юридическая компания
• Взыскание задолженности
• Проведение торгов
• Ликвидация
• Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ
В ФОРМЕ ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор электронного аукциона** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by | | |
| **Продавец** | ОАО «Банк БелВЭБ», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29 | | |
| **Предмет публичных торгов (электронного аукциона)** | | | |
| **Одиннадцатые повторные публичные торги в форме электронного аукциона. Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) опубликовано 16.07.2025 в газете «Звязда» № 134 (30522), стр. 9** | | | |
| Лот № | Наименование | Начальная цена | Минимальная цена |
| 1 | Изолированное помещение (квартира) 21 по адресу: Минская область, Солигорский р-н, г. Солигорск, ул. Строителей, д. 53, общей площадью по СНБ 160,3 кв. м Количество жилых комнат: 5, этаж: 5-й и 6-й | 353 200,40 бел. руб. без НДС | 211 920,24 бел. руб. без НДС |
| 2 | Изолированное помещение (квартира) 23 по адресу: Минская область, Солигорский р-н, г. Солигорск, ул. Строителей, д. 53, общей площадью по СНБ 121,5 кв. м. Количество жилых комнат: 4 | 288 141,33 бел. руб. без НДС | 201 698,93 бел. руб. без НДС |
| 3 | Изолированное помещение (квартира) 25 по адресу: Минская область, Солигорский р-н, г. Солигорск, ул. Строителей, д. 53, общей площадью по СНБ 121,2 кв. м. Количество жилых комнат: 4 | 287 487,47 бел. руб. без НДС | 201 241,23 бел. руб. без НДС |
| **Задаток:** 5 % от начальной цены предмета электронного аукциона. В белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – **ООО «Индустрия Инноваций»** | | | |
| **Шаг электронного аукциона** – 5 % от начальной цены лота (не изменяется в ходе торгов) | | | |
| Условия участия и порядок проведения электронного аукциона размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной площадки ООО «Индустрия Инноваций» https://iintorgi.by. | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи – 10 (десять) рабочих дней** после электронного аукциона. | | | |
| **Условия оплаты предмета электронного аукциона – 10 (десять) рабочих дней** со дня заключения договора купли-продажи. **Переход права собственности** – после полной оплаты имущества | | | |
| **Торги проводятся в соответствии с регламентом ООО «Индустрия Инноваций», размещенным по адресу: https://iintorgi.by** | | | |
| Победитель электронного аукциона либо единственный участник, которому будет предложен для приобретения предмет электронного аукциона (претендент на покупку), обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 0,7 % от конечной цены продажи лота, но не менее 200,00 бел. руб. в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения публичных торгов (аукциона) | | | |
| Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее, чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона) | | | |
| **Дата и время проведения торгов (аукциона):** 12.08.2025, начало торгов – 10.00, окончание торгов – 16.00. Заявки на участие в электронном аукционе принимаются с 02.08.2025 с 09.00 по 11.08.2025 г. до 17.00. Электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов | | | |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by** | | |

**ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга»**

*220013, г. Минск, ул. П. Бровки, 8, комн. 201.*

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ ОБЩЕСТВА

**Собрание состоится 13 августа 2025 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. П. Бровки, 8, актовый зал общества.**

Орган, созывающий собрание акционеров, – Совет директоров ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга», основание созыва – собственная инициатива Совета директоров ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга».

Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания с 14.00 до 14.45.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, осуществляется при предъявлении ими документов, подтверждающих их личность и полномочия. При регистрации акционеры предъявляют документ, удостоверяющий личность; представители акционеров предъявляют документ, удостоверяющий личность, и подтверждают свои полномочия надлежащим образом оформленной доверенностью (руководители юридических лиц – акционеров – документом, подтверждающим статус руководителя).

**Повестка дня:**

**1.** Утверждение количественного и персонального состава счетной комиссии.
**2.** Внесение изменений в устав ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга».
**3.** Избрание членов Совета директоров ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга».
**4.** Определение размера вознаграждений членам Совета директоров ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга».

Лица, имеющие право на участие в собрании, имеют право ознакомиться с информацией (документами), подлежащими представлению при подготовке к проведению собрания, начиная с 8 августа 2025 года ежедневно (кроме субботы и воскресенья) в юридическом управлении ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга» (220013, г. Минск, ул. П. Бровки, 8) с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

Окончание приема предложений в повестку дня Собрания – 4 августа 2025 г.

***Совет директоров ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга».***

УНП 100135676

З НАГОДЫ

# НА ВЫСОКІМ АРГАНІЗАЦЫЙНЫМ

## За паўгода Белчыгунка перавезла 28 мільёнаў пасажыраў

У першую нядзелю жніўня традыцыйна адзначаецца Дзень чыгуначніка. Каб павіншаваць людзей, намаганнямі якіх мы камфортна пераадольваем адлегласці на цягніку, а таксама азнаёміцца са спецыфікай работы «штаба» лідара нацыянальнай сістэмы перавозак, Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА наведаў Цэнтр кіравання перавозкамі Беларускай чыгункі і пагутарыў з калектывам.



Беларуская чыгунка — гэта 5,5 тысячы кіламетраў эксплуатацыйнай даўжыні чыгуначных шляхоў, звыш 25 % якіх электрыфікаваны. Штогод айчынныя чыгуначнікі перавозяць больш як 100 мільёнаў тон грузаў. Кожны дзень на больш як 200 чыгуначных станцыях ажыццяўляецца пагрузка звыш 200 тысяч тон грузу. Калектыў Белчыгункі — гэта 60 тысяч супрацоўнікаў, звыш 400 дынастый.

### ВЫТРЫМКА І АПЕРАТЫЎНАСЦЬ

Цэнтр кіравання перавозкамі — структурнае падраздзяленне Беларускай чыгункі, прызначанае для аператыўнага кіравання перавозачным працэсам на ўсёй працягласці беларускай чыгункі. Адным словам, гэта яе «сэрца», дзе прымаюцца важныя рашэнні, накіраваныя на забеспячэнне своечасовасці дастаўкі пасажыраў і грузаў, папярэджанне надзвычайных сітуацый. Больш эфектыўна кіраваць сотнямі цягнікоў дыспетчарам дапамагаюць найноўшыя тэхналогіі. Спецыялісты загадзя папярэдзяць машыніста аб дрэве, якое ў выніку ўрагану апынулася на чыгуначных пуцях, створаць камфортныя ўмовы для таго, каб сустрэчныя саставы размінуліся.

«Сёння па беларускай чыгунцы штодзённа праходзіць каля 1300 цягнікоў, з якіх каля 650 — пасажырскага руху, — адзначыў **першы намеснік начальніка службы перавозак Упраўлення Беларускай чыгункі Валерый**

ЖНІВО-2025

# БЕЗ АГЛЯДКІ НА НАДВОР'Е

## Засекі папаўняюцца новым ураджаем

Нягледзячы на даволі складаныя кліматычныя ўмовы, жніво ў Беларусі набірае абароты. Брэсцкая вобласць пераадолела паказчык па намалоце 500 тысяч тон збожжа. Аб гэтым БелТА паведаміў старшыня камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Брэсцкага аблвыканкама Анатоль ШЧУПЛЯНКОЎ.



### ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ КОЖНУЮ МАГЧЫМАСЦЬ

«Брэсцкая вобласць першай у краіне намалаціла паўмільёна тон збожжа. На раніцу 1 жніўня ў нас 538 тысяч тон збожжавых і зернебабовых (без рапсу). У рэгіёне ўбрана 35 % плошчаў. Ураджайнасць 46,5 ц/га», — адзначыў Анатоль Шчуплянкоў.

Пяць раёнаў Брэстчыны з'яўляюцца лідарамі па ўраджайнасці. У Баранавіцкім, Ляхавіцкім, Жабінкаўскім, Драгічынскім і Іванаўскім раёнах у сярэднім атрымліваюць 50 і больш цэнтнераў. «Па яравым ячмені ўраджайнасць каля 53 ц/га. Гэта на 16 ц/га вышэй за ўзровень мінулага года», — адзначыў старшыня аблсельгасхарча.

Аграрыі працуюць без аглядкі на надвор'е. Выкарыстоўваюць кожную магчымасць, каб убраць збожжа і пакласці яго ў засекі. «Хлебаробы Брэсцкай вобласці нарошчваюць тэмпы і павялічваюць плошчы ўборачнай», — падкрэсліў Анатоль Шчуплянкоў. Паралельна са жнівом у гаспадарках займаюцца нарыхтоўкай кармоў і падрыхтоўкай да азімай сяўбы.

### ІМКНЕННЕ ДА ПЕРАМОГІ

Першым маладым камбайнерам-двухтысячнікам у Гродзенскім раёне стаў **Дзяніс КРУГЛІКАЎ — механізатар СВК імя Дзеньшчыкова,** паведамілі БелТА ў Гродзенскім абласным камітэце БРСМ.

Гэта ўжо другая перамога маладога камбайнера на жніве-2025. На мінулым тыдні ён прымаў віншаванні з першай намалочаная тысячай тон, і таксама першым з моладзі ў раёне. А летась па выніках уборачнай кампаніі стаў другім у абласным спаборніцтве за дасягненне высокіх паказчыкаў на ўборцы ўраджаю збожжавых і зернебабовых культур сярод старшых камбайнераў маладзёжных экіпажаў.

Дзяніс Круглікаў працуе механізатарам у СВК імя Дзеньшчыкова два гады, сваёй адказнасцю, стараннасцю ў працы, матываванасцю заслужыў давер і павагу і ў кіраўніцтва, і ў калег. У Луцкаўляны, цэнтральную сядзібу гаспадаркі, Круглікавы прыехалі ўсёй сям'ёй. У аграгарадку ім выдзелілі добраўпарадкаваную кватэру. Жонка працуе медсястрой у мясцовай бальніцы, дачка перайшла ў трэці клас Луцкаўлянскай школы.

«Дзяніс — чалавек з актыўнай жыццёвай пазіцыяй, — так характарызуе хлопца **сакратар пярвічнай арганізацыі БРСМ СВК Мікалай ЖУРНЕВІЧ.** — Усё, за што бярэцца, што яму даручаюць, робіць з энтузіязмам, заўсёды накіраваны на вынік. Да ўдзелу ў праекце «Моладзь — за ўраджай» падыходзіць з высокай зацікаўленасцю, тэлефануе, удакладняе свае пазіцыі, імкнецца да перамогі».

Як адзначае суразмоўца, Дзяніс таксама з'яўляецца прыкладам для моладзі ў адносінах да сваёй сям'і і родных. «Круглікавы вельмі дружная сям'я, — кажа Мікалай Журневіч. — Дзяніс з любоўю клапоціцца пра жонку і дачку. У вольны час выбіраецца да бацькоў, каб дапамагчы ім».

Сам лідар маладзёжнага спаборніцтва нешматслоўны. У яго цяпер на рахунку кожная хвіліна: пасля дажджоў, якія не давалі тэхніцы разгарнуцца на палях на ўсю моц, устанавілася сонечнае надвор'е, і яго трэба выкарыстоўваць па максімуме. «Праца ў сельскай гаспадарцы мне па душы, — падзяліўся Дзяніс Круглікаў. — І бацькі, і сваякі — усе аграры, і я пайшоў у рэчышча сямейнай традыцыі.

# УЗРОЎНІ

## і 45,5 мільёна тон грузу

**МАЦКЕЛЬ.** — Гэта дазволіла нам у першым паўгоддзі 2025 года перавезці 28 мільёнаў пасажыраў і 45,5 мільёна тон грузу».

**Дыспетчар участка «Маладзечна — Асіповічы» Цэнтра кіравання перавозкамі Упраўлення Беларускай чыгункі Міхаіл ФЯСЬКОЎ** расказаў, што работа ў дыспетчарскай патрабуе ад спецыялістаў вытрымкі, канцэнтрацыі ўвагі, дысцыплінаванасці, бо на працягу 12 гадзін ім даводзіцца кіраваць працэсам на чыгунцы ў рэжыме рэальнага часу. «Арганізоўваем пропуск цягнікоў і ствараем бяспеку руху на вылучаных участках, — коратка сфармуляваў ён свае задачы. — Нярэдка бываюць няштатныя сітуацыі, калі даводзіцца перадаваць паведамленні ў розныя службы. Напрыклад, траўміраванне чалавека на чыгуначных пуцях або перашкода на чыгуначных пуцях у выніку непагадзі. На ўсё гэта рэагуем аператыўна».

## З УЛІКАМ СЁННЯШНІХ РЭАЛІЙ

У размове з журналістамі Ігар Сергяенка звярнуў увагу на тое, што работа па кіраванні перавозкамі чыгуначным транспартам наладжана на высокім арганізацыйным узроўні. «Беларуская чыгунка актыўна развіваецца, мадэрнізуецца, — канстатаваў Старшыня Палаты прадстаўнікоў. — І цяпер праводзяцца работы па далейшай электрыфікацыі асобных участкаў. Рэалізоўваюцца сумесныя мерапрыемствы, рыхтуюцца сумесныя праекты з калегамі Расійскай чыгункі».

Параўноўваючы чыгунку 30—40-гадовай даўнасці з цяперашнім часам, спікер акцэнтаваў увагу на значных пераменах. «Штосутачна на станцыях грузіцца больш чым 200 тысяч грузу, перавозіцца звыш 200 тысяч пасажыраў, — канкрэтызаваў ён. — Гэта перавозкі і прыгараднымі цягнікамі, цягнікамі мясцовых зносін, цягнікамі, якія накіроўваюцца ў Расійскую Федэрацыю. Па пэўных прычынах сёння рух на Захад закрыты, але мы заўсёды гатовы да супрацоўніцтва з нашымі суседзямі і партнёрамі».

Ігар Сергяенка назваў Беларускую чыгунку даволі складаной гаспадаркай, якая заўсёды працавала як ваенізаваная структура. «Усе людзі ў форме, але форма — гэта не проста атрыбут, — удакладніў ён. — Форма азначае дакладнасць, стараннасць, сістэмную арганізацыю. Усе цягнікі ў нас ходзяць дакладна па раскладзе: пасажырскія і грузавыя».

Падчас сустрэчы з калектывам Белчыгункі спікер праінфармаваў аб дзейнасці Палаты прадстаўнікоў, спыніўся на актуальнасці шэрагу заканадаўчых рашэнняў. Ігар Сергяенка звярнуў увагу на тое, што закон, які рэгламентуе работу чыгуначнага транспарту, быў прыняты ў 1999 годзе. «Ён фактычна базавы, не мяняўся, — сказаў спікер. — Гэта сведчыць аб стабільнасці ў свой час прапрацаваных норм, на якія сёння абапіраюцца ў тым ліку і работнікі, і кіраўнікі чыгуначнага транспарту. Можа быць, наспела неабходнасць унесці пэўныя змены з улікам сённяшніх рэалій — мы гатовы выслухаць вашы прапановы».

**Вераніка КАНЮТА.**

**Фота БелТА.**



Вельмі падабаецца і працаваць у гаспадарцы, і жыць у вёсцы. Вядома, імкнуся дабіцца перамогі».

Як дапоўніў сакратар пярвічкі БРСМ, у СВК імя Дзеньшчыкова ў рэспубліканскім спаборніцкім праекце «Моладзь — за ўраджай» удзельнічаюць тры камбайнеры і два кіроўцы. Усе тры камбайнеры ўжо перасягнулі тысячную мяжу па намалотах. А Кірыл Саўчанка стаў першым маладым вадзіцелем, які перавёз 3 тысячы тон збожжавых і зернебабовых культур. Аб гэтым паведаміла **афіцыйны прадстаўнік ЦК БРСМ, куратар рэспубліканскага праекта «Моладзь — за ўраджай» Таццяна МАКСІМОВІЧ.** Хлопец пабіў свой жа рэкорд — 29 ліпеня ён першы ў краіне перасягнуў мяжу ў 2 тысячы тон.

СВК імя Дзеньшчыкова традыцыйна ў лідарах на жніве. **Галоўны аграном Дзмітрый ШЫНТАР** паведаміў, што ў гаспадарцы ўбрана больш за палову плошчаў, ураджайнасць збожжавых і зернебабовых складае 87,5 ц/га, намалот — звыш 14 тысяч тон. Завершана ўборка азімага рапсу, яго ўраджайнасць — 64,6 ц/га.

## ПРАФСАЮЗЫ НА СУВЯЗІ

Прафсаюзы дапамагаюць работнікам розных прадпрыемстваў вырашыць пытанні з нявыплатай адпускных, матдапамогі і адмовай у пераразліку ў сувязі з перапрацоўкай. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.

Міжгаліновы маніторынгавы цэнтр ФПБ з 1 жніўня змяніў час працы. Усяго з пачатку работы цэнтра (21 мая) паступіла больш за тысячу зваротаў. Задаць сваё пытанне, звязанае з працоўнымі адносінамі, цяпер можна штодня, у тым ліку ў выхадныя і святочныя дні, — з 8.00 да 20.00 па адзіным нумары 8 801 100 1111. Званок бясплатны для абанентаў «Белтэлекама» і мабільных аператараў БеСТ (Life), А1, МТС.

«Ніводнае пытанне не застаецца без увагі. Калі зварот адносіцца да кампетэнцыі прафсаюзаў, даюцца не толькі неабходныя кансультацыі, але і па запыце работніка прадстаўнікі прафсаюзаў выязджаюць у арганізацыю для дэталёвага вывучэння сітуацыі і вырашэння працоўнай спрэчкі. Калі ж пытанне не ўваходзіць у кампетэнцыю прафсаюзаў, спецыялісты цэнтра дапамагаюць сарыентаваць грамадзян, дзе можна атрымаць неабходную кансультацыю. Таксама важным арыенцірам работы цэнтра з'яўляецца аператыўнасць — адказ тым, хто звярнуўся, даецца ў самыя кароткія тэрміны. Дарэчы, пытанні паступаюць ад работнікаў розных сфер дзейнасці з усіх рэгіёнаў краіны», — расказалі ў прэс-службе Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.

Так, у цэнтр звярнуўся работнік аднаго з сельгаспрадпрыемстваў Гомельскай вобласці, якому наймальнік не зрабіў пераразлік у сувязі з перапрацоўкай. Прадстаўнікі прафсаюза правялі перамовы з кіраўніцтвам арганізацыі, і работнік атрымаў належныя выплаты.

Як вядома, у перыяд уборачнай кампаніі прафсаюзы забяспечваюць падтрымку ўдзельнікаў жніва. Спецыялісты гатовы аператыўна адрагаваць на праблемныя і спрэчныя сітуацыі, звязаныя з умовамі, аплатай працы аграрыяў.

**Фота БелТА.**

### Тым часам

## КЛІМАТЫЧНЫЯ ЎМОВЫ ПАЛЕПШАЦЦА

Як будуць складацца ўмовы для ўборачных работ у пачатку жніўня, паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Паводле звестак аграметэаролагаў, у глебах пад бульбай, караняплодамі і кукурузай запасы вільгаці добрыя. У многіх раёнах Віцебскай, у паўночных і цэнтральных раёнах Магілёўскай і месцамі ў Мінскай вобласці гэтыя паказчыкі павышаныя. Дажджы, якія прайшлі пасля інструментальнага вывучэння сітуацыі спецыялістамі Белгідрамета, яшчэ павялічылі запасы вільгаці.

«Верхні 10-сантыметровы пласт глебы на большай частцы тэрыторыі краіны моцна ўвільготнены, што ўскладняе працу тэхнікі на палях. У пачатку жніўня ўмовы для ўборачных работ на тэрыторыі Беларусі крыху палепшацца — дажджы будуць мець кароткачасовы характар і пройдуць не паўсюдна», — адзначылі ў Белгідрамеце.


## ИЗВЕЩЕНИЕ
### о проведении электронных торгов и повторных электронных торов с понижением начальной цены на 50 %

Оператор ЭТП: «Единая система электронных торгов», г. Минск, ул. Берсона, 1А, комн. 513, тел. 8 (017) 200-73-33; (29) 865 21 21, (29) 521 91 18; УНП 190318109. Адрес ЭТП: www.torgi.gov.by.

**Продавец: государственное предприятие «Белоруснефть-Транс»,**
г. Гомель, ул. Книжная, 15б, УНП 491317683.

**Местонахождение транспортных средств (лотов): Лот № 3 – г. Гомель, ул. Проселочная, 16а; лоты №№ 1, 2, 4 – г. Фаниполь, ул. Заводская, 9д.**

| Предмет электронных торгов |
|---|
| **Лот № 1** – Грузовой специальный фургон-рефрижератор MAZ 437143 341, 2010 г. в. (рег. знак № АЕ 6913-3), инвентарный номер № 3437, по бух. учету, по начальной цене 3 596,46 бел. руб., продажа будет производиться с учетом НДС |
| **Лот № 2** – Грузовая специальная цистерна MAZ-MAN 632036 АС-16, 2012 г. в. (рег. знак № АМ 2767-3), инвентарный номер № 86643, по бух. учету, по начальной цене 23 143,72 бел. руб., продажа будет производиться с учетом НДС |
| **Предмет электронных повторных торгов с понижением начальной цены на 50 %** |
| **Лот № 3** – Полуприцеп MAZ 975830 3021, 2009 г. в. (рег. знак № А 0211 Е-3), инвентарный номер № 202201, по бух. учету, по цене 4 349,95 бел. руб., продажа будет производиться с учетом НДС |
| **Лот № 4** – Прицеп специальный цистерна РС 14, год выпуска не определен (рег. знак № А 3898 В-3), инвентарный номер № 9-172, по бух. учету, по цене 8 313,34 бел. руб., продажа будет производиться с учетом НДС |

Установить задаток от начальной цены для участия в аукционных торгах в размере:
- **60 %** для лота № 1;
- **10 %** для лота № 2;
- **35 %** для лотов №№ 3, 4.

Задаток перечисляется в белорусских рублях на р/с РУП «Информационный центр Министерства экономики Республики Беларусь»: BY88 BELB 3012 0027 8700 2022 6000, ОАО «Банк БелВЭБ», УНП 190318109, ОКПО 37533622, BIC BELBBY2X. Контактные телефоны операторов торговой площадки: 8 (017) 200 73 33; 8 (029) 865 21 21, 8 (029) 521 91 18.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение 20 (двадцати) календарных дней после проведения электронных торгов.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки «Единая система электронных торгов», по электронному адресу: www.torgi.gov.by. Победителем электронных торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот.

**Дата и время начала и завершения электронных торгов: с 02.09.2025, 9.00 по 02.09.2025, 16.00.** Для участия в электронных торгах на электронной торговой площадке необходимо подать заявку на участие в электронных торгах и пройти регистрацию в качестве участника электронных торгов, а также перечислить задаток в срок до 02.09.2025, 9.00. Если за 3 минуты до окончания аукциона поступила ставка на лот, аукцион продлевается на эти 3 минуты, с момента поступившей ставки. Если же в течение добавленного времени поступила новая ставка, время аукциона продлевается с момента поступления ставки еще на 3 минуты и так до тех пор, пока в течение 3 минут не поступит ни одной ставки. В этом случае торги считаются завершенными.

Шаг аукционных торгов установить в размере от 5 % от начальной стоимости.

Условия оплаты предмета электронных торгов. Победитель аукциона обязан: подписать протокол о результатах аукциона; возместить Продавцу затраты на организацию и проведение электронных торгов в сроки согласно заключенному договору купли-продажи; оплатить приобретаемое имущество продавцу согласно заключенному договору купли-продажи. Задаток, уплаченный участниками аукциона, ставшими победителями, будет зачтен в счет окончательной стоимости объекта.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по имуществу республики Беларусь – www.gki.gov.by в подразделе «Движимое имущество» раздела «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА».

Контактные тел.: 8 (017) 200-73-33; (29) 865 21 21, (29) 521 91 18 (Оператор ЭТП); 8 (029) 290 72 63 (Продавец).



## ДОПОЛНЕНИЕ
### к проектной декларации ООО «СМУ-87»,

*опубликованной в газете «Звязда» 11.02.2025 г.*

**по объекту «Возведение жилой застройки по ул. Мястровской в м-не Лебяжий г. Минск»**

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, в жилом доме № 1 по г/п с пристроенным двухэтажным гаражом-стоянкой предлагаются:

**15 (пятнадцать)** однокомнатных квартир **площадью от 29 до 39 кв. м включительно,** стоимость 1 кв. метра **от 6 039 до 6 691 белорусских рублей;**

**10 (десять)** однокомнатных квартир **площадью от 40 до 50 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 5 887 до 6 064 белорусских рублей;**

**15 (пятнадцать)** двухкомнатных квартир **площадью от 51 до 62 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 5 673 до 6 039 белорусских рублей;**

**1 (одна)** двухкомнатная квартира **площадью от 76 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 5 582 до 5 906 белорусских рублей;**

**7 (семь)** двухкомнатных квартир **площадью от 84 до 97 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 5 277 до 5 592 белорусских рублей.**

На предприятии действует система регулирования стоимости, зависящая от площади, этажа и условий оплаты строящегося объекта.

Оплата производится в белорусских рублях. Указанные цены действуют до момента опубликования новой проектной декларации, дополнения или изменения к ней, и при условии наличия квартир, предложенных для заключения по договорам создания объектов долевого строительства.

**Условия оплаты квартиры** – полная либо поэтапная оплата цены договора в соответствии с действующей в организации системой рассрочки платежей от даты следующей за днём регистрации договора долевого строительства в Комитете строительства и инвестиций Мингорисполкома.

Ознакомиться с планировками квартир можно по предварительной записи в офисе продаж «Гранд Кристал» по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 19, пом. 1567, по графику: пн-пт – с 9.00 до 19.00, сб – с 10.00 до 16.00, вс – выходной, тел. 375 (44) 711-33-00.

Прием заявлений на заключение договоров создания объектов долевого строительства будет осуществляться с 9.00 04.08.2025 г. в порядке живой очереди в офисе продаж «Гранд Кристал» по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 19, пом. 1567.

УНП 193672656

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ОАО «Н Холдинг»**
***проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности***
**ОАО «Минский завод «Термопласт»**

**Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Н Холдинг» по организации и проведению аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **ЛОТ № 1** | Капитальное строение с инв.500/С-22919, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Кнорина, д. 50. Площадь – 4056,3 кв. м. Наименование – Здание административно-хозяйственное, литер А 7/к-кп. Назначение – Здание административно-хозяйственное. Обременение: аренда. Капитальное строение расположено на земельном участке с кадастровым номером 500000000009007867, площадью 0,1422 га, предоставленном ОАО «Минский завод Термопласт» на праве аренды (срок действия: по 30.04.2031). На земельном участке установлены следующие ограничения (обременения): охранная зона линий связи и радиофикации, площадь 0,0133 га; охранная зона сетей и сооружений водоснабжения, площадь 0,0230 га; охранная зона сетей и сооружений канализации, площадь 0,0038 га | | | | |
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **8 265 600,00** | **Задаток, BYN** | **826 560,00** | **Шаг аукциона** | **5 %** |
| **Сведения о продавце, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «МИНСКИЙ ЗАВОД «ТЕРМОПЛАСТ», Республика Беларусь, 220103, г. Минск, ул. Кнорина, 50. Тел. +375172811340. E-mail: office@oaotermoplast.by | | | | |
| **Сведения об организаторе аукциона** | ОАО «Н Холдинг», 220029, г. Минск, пр-т Машерова, 11, пом. 1. Тел.: 8 029 754 63 46 (Мария) | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **10 (десяти) рабочих дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукционов** | Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение 5 (пяти) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона, а также в течение 3 (трех) рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона выплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 1 % от цены продажи предмета аукциона на основании счета, выставленного организатором аукциона | | | | |
| **Условия оплаты** | Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях (не резидентами в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты) на следующие банковские реквизиты: р/с BY79 AKBB 3012 0000 1634 1000 0000 (BYN) в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, 220005, г. Минск, пр-т Независимости, д. 56. Получатель – Открытое акционерное общество «Н Холдинг», УНН 101059240 ОКПО 37392696. Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за объект, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе** | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **по 14 августа 2025 года (включительно),** в рабочие дни – с 9.00 до 16.55, по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1 | | | | |
| **Место, дата и время проведения аукциона** | Открытый аукцион состоится **15 августа 2025 года** в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1, зал совещаний ОАО «Н Холдинг» | | | | |
| Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время, без объяснения причин, но не позднее, чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от его проведения | | | | | |



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
*(Организатор торгов и Оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, местонахождение: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321)*
по поручению **ОАО «Миноблавтотранс» филиал «Автомобильный парк № 17»**
*(Продавец, место нахождения: г. Столбцы, ул. Я. Коласа, 96)*
проводит открытый аукцион по продаже:

**Лот № 1: автомобиль грузовой MAZ 5440 E9, 2013 г. в., регистрационный знак АМ 4090-5, рама № Y3M5440E9D0000239, цвет белый, седельный тягач, дизель, объём двигателя – 12 л, мех. коробка передач.**
**Начальная цена – 38 280,00 бел. руб.**
Задаток 10 % от начальной цены – **3 828,00 бел. руб.**

**Лот № 2: полуприцеп бортовой тентовый MAZ-975830-3012, 2013 г. в., регистрационный знак А 6109 В-5, рама № Y3M975830D0006205.**
**Начальная цена – 20 880,00 бел. руб.**
Задаток 10 % от начальной цены **– 2 088,00 бел. руб.**

**Лот № 3: полуприцеп бортовой тентовый WIELTON NS34ST, 2008 г. в., регистрационный знак А 4816 А-5, рама № SUDNS1STA81015636.**
**Начальная цена – 24 000,00 бел. руб.**
Задаток 10 % от начальной цены – **2 400,00 бел. руб.**

Транспортные средства расположены по адресу:
**Минская область, г. Столбцы, ул. Я. Коласа, 96.**

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, OTHR.

**Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течении 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение в размере 10 (десяти) процентов от цены продажи предмета аукциона, а также возмещает затраты на публикацию извещения о проведении торгов.**

Электронные торги проводятся в порядке, установленным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by. Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by.

Электронные торги состоятся **03.09.2025** в **10.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие* и необходимые документы принимаются по **02.09.2025** до **17.00** по указанному адресу.

**Тел.: 8 (017) 516-80-65; 8 (029) 102-21-17, 516-80-64.**
**Тел. для осмотра: 8 (044) 7789057.**

УНН 601070236


ЭКАНАМІКС

# ПРАГНОЗ — ПАЗІТЫЎНЫ

## Кіраўнікі прампрадпрыемстваў плануюць павелічэнне попыту на прадукцыю, рост аб'ёмаў вытворчасці і прыбытку

Аб гэтым сведчаць вынікі кан'юнктурнага апытання, праведзенага НДЭІ Мінэканомікі ў ліпені бягучага года, расказалі ў прэс-службе эканамічнага ведамства.



Аб станоўчай дынаміцы выпуску паведаміла больш за трацціну топ-менеджараў, звыш 70 % апытаных канстатавалі павелічэнне альбо захаванне попыту на сваю прадукцыю.

Каэфіцыент загрузкі вытворчых магутнасцяў у сярэднім па прамысловасці склаў 69 %, сярэдні перыяд забяспечанасці прадпрыемстваў заказамі — тры месяцы.

Большасць рэспандэнтаў (88 %) адзначаюць захаванне альбо рост колькасці работнікаў.

— Вынікі апытання сведчаць аб імкненні прадпрыемстваў актыўна інвеставаць у сваё развіццё. Сярод кірункаў выкарыстання капіталу лідзіруюць абнаўленне (79 %) і пашырэнне (33 %) вытворчых магутнасцяў. Для 18 % прамысловых прадпрыемстваў значным было пытанне інвеставання ў рэсурсазберажэнне. У зніжэнне працоўных выдаткаў укладвалі 17 % кампаній, — пракаментавалі ў Мінэканомікі, дадаўшы, што прагнозная ацэнка змены агульнага эканамічнага становішча застаецца пазітыўнай.

У ведамстве адзначылі, што большасць кіраўнікоў прагназуюць павелічэнне альбо захаванне попыту на прадукцыю, якая выпускаецца (90 %), і аб'ёмаў яе вытворчасці (85 %), 36 % рэспандэнтаў — рост прыбытку.

# СПРАВЕ НА КАРЫСЦЬ

## Закон «Аб урэгуляванні неплацежаздольнасці» захаваў найлепшыя практыкі санацыі і палепшыў якасць кіравання фінансавым аздараўленнем прадпрыемстваў

Пра гэта заявіў дырэктар Дэпартамента па санацыі і банкруцтве Міністэрства эканомікі Юрый ТАРАКАНАЎ падчас выязнога пасяджэння Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы на тэму «Вывучэнне практыкі прымянення новых механізмаў паляпшэння фінансава-гаспадарчага стану прадпрыемства, прадугледжаных Законам «Аб урэгуляванні неплацежаздольнасці», паведамілі ў прэс-службе Мінэканомікі.



Дарэчы, мерапрыемства праходзіла на пляцоўцы Мінскага халадакамбіната № 2.

Дырэктар Дэпартамента па санацыі і банкруцтве падкрэсліў, што прымяненне закона з 2023 года дазволіла захаваць найлепшыя практыкі санацыі і «кіраванай ліквідацыі» неэфектыўнасці прадпрыемстваў, палепшана якасць кіравання іх фінансавым аздараўленнем.

— Галіновымі органамі і выканкамамі забяспечана пераемнасць работы іх камісій па папярэджанні неплацежаздольнасці, вызначаны аптымальныя формы кіравання працэсамі ўрэгулявання неплацежаздольнасці. Арганізаваны пастаянны аналіз эфектыўнасці мерапрыемстваў дасудовага і судовага аздараўлення, — паведаміў Юрый Тараканаў.

Паводле яго слоў, зацверджаная ўрадам «дарожная карта» (комплекс мер па папярэджанні банкруцтва) стала надзейнай дапамогай кіраўнікам прадпрыемстваў у ходзе работы па павышэнні іх эфектыўнасці.

Як адзначыў кіраўнік дэпартамента, дзяржаўныя органы актыўна выкарыстоўваюць прадастаўленыя законам паўнамоцтвы па своечасовай дыягностыцы падведамных прадпрыемстваў, узгадненні планаў іх санацыі, аналізу іх выканання і неабходнай карэкціроўцы, абароне інтарэсаў дзяржавы і працоўных калектываў, вырашэнні пытанняў, звязаных з вытворчасцю, кадравым патэнцыялам, разлікамі, маёмасцю.

Юрый Тараканаў таксама прадставіў вынікі па асноўных кірунках сферы ўрэгулявання неплацежаздольнасці і адзначыў іх станоўчую дынаміку.

У ходзе мерапрыемства ўдзельнікі абмяняліся вопытам паляпшэння фінансава-гаспадарчага стану асобных прадпрыемстваў, выяўленымі праблемамі і прапановамі па іх вырашэнні.

У завяршэнні пасяджэння была акцэнтавана ўвага на важную ролю карэкціровак закона, якія плануюцца да падрыхтоўкі ў 2026 годзе, з улікам выяўлення на практыцы пытанняў, што патрабуюць дадатковага ўрэгулявання.

# У СТЫЛІ ЭЛЕКТРА

## МАРГ праверыў абгрунтаванасць павелічэння цэн на паслугі па зарадцы электрамабіляў




У МАРГ паступілі звароты грамадзян, якія датычацца павелічэння тарыфаў на паслугі па зарадцы электрааўтамабіляў у сетцы «Маланка», якая аб'ядноўвае каля 750 зарадных станцый па краіне. І вось, што паказала праверка.

За бягучае паўгоддзе колькасць электрамабіляў у краіне павялічылася на 40 %.

Як растлумачылі ў МАРГ, для забеспячэння беспераішкоднага і камфортнага перамяшчэння электрамабіляў, а таксама задавальнення попыту спажыўцоў неабходна апераджальнае будаўніцтва зарадных станцый, што патрабуе значных інвестыцыйных укладанняў. Цяпер гэтыя выдаткі перавышаюць даходы арганізацыі, і праект застаецца стратным.

— Таксама было ўстаноўлена, што рост тарыфаў звязаны з павелічэннем выдаткаў на абслугоўванне саміх станцый і электраэнергію. Па выніку аналізу парушэнні не выяўленыя, — запэўнілі ў МАРГ.

Дарэчы, з 1 жніўня бягучага года тарыфы на паслугі зарадкі электрамабіляў у сетцы «Маланка» павысяцца: павольная зарадка на 8,9 % — з 0,45 да 0,49 руб./кВт*г; хуткая зарадка на 6,6 % — з 0,61 да 0,65 руб./кВт*г.

КАМУНАЛЬНЫЯ СТАСУНКІ

# «ДЫНАМІКА СТАНОЎЧАЯ, ЯШЧЭ Б АД ЖЫХАРОЎ БОЛЬШ РАЗУМЕННЯ...»

## Аб чым гаварылі на калегіі МЖКГ у Гродне

Размова на выязной калегіі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі ішла аб выніках работы сістэмы ЖКГ Беларусі ў першым паўгоддзі, а таксама аб рэалізацыі Дырэктывы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 4 сакавіка 2019 года № 7 «Аб удасканаленні і развіцці ЖКГ краіны». На парадку дня таксама была дзяржаўная праграма «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» на 2021–2025 гг. і работа службы 115 на тэрыторыі Гродзенскай вобласці.

Як адзначыў **міністр ЖКГ Генадзь ТРУБІЛА**, усе паказчыкі паўгоддзя сістэмай жыллёва-камунальнай гаспадаркі дасягнуты. Адрамантавана больш за 4,5 млн км$^2$ вулічна-дарожнай сеткі, выкананы капітальны рамонт каля 1,4 млн м$^2$ жылля. Акрамя таго, паспяхова ідзе рамонт дахавых пакрыццяў, ужо большая частка таго, што было запланавана, зроблена. З апярэджаннем таксама вядуцца работы па будаўніцтве станцый абезжалезвання.

— За першае паўгоддзе ўжо пабудавана 90 станцый, праграма амаль завершана, на наступны год застануцца толькі невялікія населеныя пункты, дзе водазабеспячэнне ажыццяўляецца іншымі пастаўшчыкамі. Таксама працуем над перападключэннем сістэм водазабеспячэння да ўжо пабудаваных станцый для таго, каб людзі атрымлівалі чыстую пітную ваду, — паведаміў Генадзь Трубіла.



### З КЛОПАТАМ АБ ЭКАЛОГІІ

Вялікая ўвага надаецца збору другасных матэрыяльных рэсурсаў. План па іх зборы выкананы. Адзінае, што не дапрацавалі ў рамках паўгоддзя, — дзяржзаказ на пастаўку шкла.

— У нас яшчэ ёсць паўгода наперадзе, таму, думаю, усё атрымаецца, — адзначыў міністр ЖКГ. — У гэтую пяцігодку было запланавана запусціць у работу некалькі смеццесартавальных заводаў. У Гродне такі завод ужо ўзведзены, у Ваўкавыскім раёне ён будуецца. Летась быў адкрыты Аршанскі смеццесартавальны завод. У Наваполацку вядзецца рэканструкцыя аб'екта, але завяршыць работы сёлета не ўдасца. У Віцебску і Брэсце заводы ўжо функцыянуюць, у Гомелі гатоўнасць складае 60 %. Гэта буйны смеццесартавальны завод, а самы маштабны адкрыўся ў Мінску 3 ліпеня. Зараз там ідуць пусканаладачныя работы. У будучыні плануецца будаўніцтва завода ў Пінскай зоне абслугоўвання.

**У найбліжэйшыя пяць гадоў будзе ўдзелена асаблівая ўвага буйным гарадам — з насельніцтвам 80 тысяч і большым. Там збіраецца пэўная колькасць цвёрдых камунальных адходаў, якія трэба перапрацоўваць. У малых населеных пунктах працуе 81 лінія сартавання другасных матэрыялаў. Іх трэба мадэрнізаваць, бо многія ўжо ўстарэлі і патрабуюць абнаўлення.**

Генадзь Трубіла падкрэсліў, што для паспяховай перапрацоўкі другасных матэрыялаў важна супрацоўніцтва грамадзян і прадпрыемстваў ЖКГ. Цяпер працэнт здавання другасных матэрыялаў складае 43,1 %. Мэта — дасягнуць 64 %. Для гэтага неабходна, каб людзі больш актыўна раздзялялі адходы, а прадпрыемствы якасна перапрацоўвалі іх у другасныя матэрыялы.

### АЛЁ, ГЭТА 115?

Яшчэ адно з важных пытанняў на парадку дня — работа службы 115 у Гродзенскай вобласці. Як адзначыў Генадзь Трубіла, кожны месяц праходзяць калегіі жыллёва-камунальнай гаспадаркі, дзе абмяркоўваецца сітуацыя ў рэгіёнах. Выяўляюцца слабыя месцы, спецыялісты высвятляюць, на што трэба звярнуць увагу, каб палепшыць узаемадзеянне паміж насельніцтвам і службамі жыллёва-камунальнай гаспадаркі і іншымі арганізацыямі, якія адказваюць за гарадскую інфраструктуру.

— Некаторыя заяўкі ўжо апрацаваны, але закрытыя па розных прычынах, аб'ектыўных і суб'ектыўных. Дзесьці ідзе складанне планаў, ёсць і тэхнічныя асаблівасці, не заўсёды своечасова можна знайсці рэсурсы. Мы бачым павелічэнне зваротаў, звязаных з рамонтам асфальтавага пакрыцця ў малых населеных пунктах. Два гады таму кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на гэту праблему і даручыў вырашыць яе. Былі распрацаваны планы, і людзі бачаць, што ў нейкім аграгарадку ўжо пачалося асфальтаванне, і ім хочацца, каб у іх населеным пункце дарогі таксама былі адрамантаваныя. Але планы распісаны на сем гадоў наперад, так што паступова дарожнае пакрыццё будзе прыведзена ў парадак.

Дзякуючы службе 115 відаць, якія праблемы хвалююць грамадзян на той ці іншай тэрыторыі. Іх імкнуцца вырашыць кропкава, выкарыстоўваючы дзяржаўныя сродкі. Напрыклад, некалькі гадоў таму назіраўся значны рост колькасці зваротаў, звязаных з рамонтам дахаў. Гэта пытанне мела сур'ёзныя маштабы. Міністэрства ЖКГ звярнула на яе ўвагу, і Міністэрства фінансаў выдзеліла дадатковыя рэсурсы. Дзякуючы гэтаму за два гады праблема працёкаў у шматкватэрных дамах была амаль поўнасцю вырашана па ўсёй краіне.

### ПАРАДАК ВА ЎСІМ

Не абышлі ўвагай і мерапрыемствы Года добраўпарадкавання.

— Гродна — адзін з найстарэйшых гарадоў краіны. Цяпер мы актыўна рыхтуемся да 900-годдзя з дня заснавання. Гэта важны этап, і многае, што мы ўбачым у горадзе, якая тут абстаноўка, гаворыць само за сябе, — падкрэсліў **старшыня Гродзенскага гарадскога выканаўчага камітэта Андрэй ХМЕЛЬ**.

Не застаюцца без увагі і іншыя пытанні. У прыватнасці, адзначаецца важнасць паляпшэння стану сельскіх могілак, безгаспадарчых тэрыторый і закінутых участкаў. У міністэрстве выказалі ўпэўненасць, што ў канцы года ўсе асноўныя задачы будуць выкананы, а большасць сістэмных праблем — ліквідавана.

У цэлым міністр адзначыў станоўчую дынаміку. Пастанова, у якой дакладна прапісаны правілы наведвання парадку, сапраўды прынесла свой плён.

**Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ.**


**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)**

**информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Открытому акционерному обществу «Щучинагропродукт»**

**Аукцион состоится 21.08.2025 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| **Лот № 1** | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | ЛОТ 1:<br>- капитальное строение, инв. № 422/С-32457 (назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака, наименование – здание винзавода), обшей площадью 3911,6 кв. м, расположенное по адресу: Щучинский р-н, Рожанский с/с, 39А, винзавод около аг. Руткевичи;<br>- капитальное строение, инв. № 422/С-32458 (назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака, наименование – здание проходной), обшей площадью 158,5 кв. м, расположенное по адресу: Щучинский р-н, Рожанский с/с, 39А, проходная около аг. Руткевичи;<br>- капитальное строение, инв. № 422/С-72450 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – сооружение благоустройства), обшей площадью 4096,8 кв. м, расположенное по адресу: Щучинский р-н, Рожанский с/с, 39А/2, сооружение благоустройства;<br>- линия электропередач кабельная (электроустановки РУ-0,4 кВ, КЛ-04 кВ, ВУ и внутреннее электрооборудование винзавода).<br>Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 425886500012000029, площадью 0,2506 га (назначение – для обслуживания зданий и сооружений винзавода, расположенном по адресу: Гродненская обл., Щучинский р-н, Рожанковский с/с, 39А. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в зонах санитарной охраны водных объектов, используемых для хозяйственно-питьевого водоснабжения, в зонах санитарной охраны в местах водозабора, площадь 1,3938 га; ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь 0,0595 га; ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь 0,0501 га; ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в придорожных поласах (контролируемых зонах) автомобильных дорог, площадь 1,2713 га |
| **Начальная цена продажи** | 248 704,79 руб. (двести сорок восемь тысяч семьсот четыре рубля семьдесят девять копеек) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 24 870 руб. (двадцать четыре тысячи восемьсот семьдесят рублей) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 19.08.2025 г. до 15.00** |
| Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 11.01.2025 г. | |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony/ | |



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ

**Открытого акционерного общества «Белбуд»**

(220113, г. Минск, ул. Восточная, д. 133, оф. 1) (далее – Общество)

**Сообщаем Вам, что повторное внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Белбуд» (далее – Общество) будет проводиться в очной форме 14.08.2025 в 10.00 по адресу: 220004, г. Минск, пер. Тучинский, д. 2А, оф. 402**

**Дата, время и место проведения собрания: 14.08.2025 г. в 10.00, 220004, г. Минск, пер. Тучинский, д. 2А, оф. 402**

**Повестка дня:**

**1.** Избрание рабочих органов собрания.
**2.** О досрочном прекращении полномочий членов Наблюдательного совета Общества.
**3.** Об избрании членом Наблюдательного совета Общества Соболевского Виталия Константиновича.
**4.** Об избрании членом Наблюдательного совета Общества Чиж Ларисы Георгиевны.
**5.** Об избрании членом Наблюдательного совета Общества Лапицкого Константина Александровича.
**6.** О внесении изменений и дополнений в Устав Общества.

Органом, созывающим повторное внеочередное общее собрание акционеров Общества, согласно п. 6.4. Устава Общества, является Наблюдательный совет Общества.

Повторное внеочередное общее собрание акционеров Общества созывается в соответствии с п. 6.10 Устава ч. 2 ст. 43 Закона № 2020-XII от 09.12.1992 г. «О хозяйственных обществах»

Основание созыва: 29.07.2025 общее собрание акционеров не состоялось, требование акционера Общества ООО «Плэй хард» (УНП 193607576), решение Наблюдательного совета от 01.08.2025 года (Протокол № б/н от 01.08.2025 г.).

Порядок (с указанием адреса) ознакомления лиц, имеющих право на участие в собрании с информацией (документами), подлежащей предоставлению при подготовке к проведению собрания, по адресу: 220004, г. Минск, пер. Тучинский, д. 2А, оф. 402, в течение 2 рабочих дней до проведения внеочередного общего собрания, в рабочие дни (понедельник–пятница) в период времени – с 09.00 по 12.00, а в день проведения собрания – с 09.00 до 09.30. Предъявление документов, удостоверяющих личность (паспорт или иной документ, удостоверяющий личность) и подтверждающих полномочия (доверенность или иной документ), обязательно.

Место и время регистрации участников повторного внеочередного общего собрания акционеров Общества: с 09.30 до 10.00 в день и по месту проведения собрания.

Участники внеочередного общего собрания акционеров Общества должны иметь при себе документ, удостоверяющий личность (паспорт или иной документ, удостоверяющий личность), и документ, подтверждающий полномочия (для представителя акционера – доверенность или договор).

УНП 100794022

ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1; www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ООО «Гараторг групп», УНП 691734271, 222161, г. Жодино, пр. Мира, д. 19а, пом. 28 |

| № п/п | Наименование предмета электронных торгов | Общая площадь, кв. м | Начальная цена (с НДС 20 %), долл. США* Снижена на 10 % |
|---|---|---|---|
| 1 | Торговое помещение, Инв. номер 612/D-18829 | 17,8 | **7 401,24** |
| 2 | Торговое помещение, Инв. номер 612/D-18830 | 5,3 | **20 487,60** |
| | Торговое помещение, Инв. номер 612/D-18831 | 48,9 | |
| 3 | Торговое помещение, Инв. номер 612/D-18836 | 15,2 | **6 320,16** |
| 4 | Торговое помещение, Инв. номер 612/D-18837 | 15,2 | **6 320,16** |
| 5 | Торговое помещение, Инв. номер 612/D-18841 | 49,6 | **17 677,44** |
| 6 | Торговое помещение, Инв. номер 612/D-18842 | 25,9 | **9 230,76** |
| 7 | Торговое помещение, Инв. номер 612/D-18845 | 19,1 | **6 807,24** |
| 8 | Торговое помещение, Инв. номер 612/D-18847 | 18,2 | **38 911,75** |
| | Торговое помещение, Инв. номер 612/D-18848 | 14,8 | |
| | Торговое помещение, Инв. номер 612/D-18849 | 14,9 | |
| | Торговое помещение, Инв. номер 612/D-18850 | 17,0 | |
| | Торговое помещение, Инв. номер 612/D-18851 | 14,7 | |
| 9 | Торговое помещение, Инв. номер 612/D-18853 | 12,7 | **4 526,28** |
| 10 | Торговое помещение, Инв. номер 612/D-18854 | 22,6 | **13 863,96** |
| | Торговое помещение, Инв. номер 612/D-18855 | 16,3 | |
| 11 | Торговое помещение, Инв. номер 612/D-18856 | 21,4 | **7 626,96** |
| 12 | Административное помещение, Инв. номер 612/D-28362 | 107,2 | **19 899,00** |

**Местоположение:**
**Минская область, г. Жодино, пр. Мира, д. 19а**

*Оплата предмета электронных торгов производится в белорусских рублях в сумме, эквивалентной цене продажи лота в долл. США по курсу НБРБ на дату проведения платежа

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату внесения платежа на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязаны возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение от **4 %** до **6 %** от цены продажи в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 07.03.2025 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов:**
**22.08.2025 г., с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:**
заявки на участие в электронных торгах принимаются по **21.08.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 373 21 33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |



ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОБЪЯВЛЕННОМ АУКЦИОНЕ
И ПРЕДМЕТЕ АУКЦИОНА

**Организатор аукциона:** комитет «Минскоблимущество», тел.: 8 (017) 5004711, 5004710, 5168054, 5168055.

**Дата и время проведения повторного аукциона:**
**28 августа 2025 г. в 11.00**

**Жилое помещение: изолированное помещение**
(инв. № 601/D-8553) –
**квартира в блокированном жилом доме**

общей площадью жилого помещения 97,1 кв. м (жилая площадь – 54,1 кв. м), 1990 г. п. (принадлежности: сарай), расположенное по адресу: Минская обл., Логойский район, Янушковичский с/с, д. Жабичи, ул. Метростроевская, 3-2.

**Начальная цена предмета аукциона: 53 537,64 руб**.

*(Начальная цена понижена на 50 %).*

Извещение о проведении аукциона опубликовано на официальном сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **www.gki.gov.by**.

УНП 100104937


ВЕДАЙ НАШЫХ

# УПЭЎНЕНАЯ І ЎРАЖАЛЬНАЯ ПЕРАМОГА

## Юнак з Брэста стаў лепшым маладым географам свету

Мікалай МІСІЮК, выпускнік брэсцкай гімназіі № 2 і будучы студэнт геафака БДУ, стаў трыумфатарам сёлетняй Міжнароднай геаграфічнай алімпіяды (iGeo), якая праходзіла ў Тайландзе. У спаборніцтве, што сабрала прадстаўнікоў амаль пяці дзясяткаў краін, беларус здзівіў свет глыбокімі ведамі, аналітычным мысленнем і ўпэўненасцю ў кожным адказе. Яго перамога — вынік шматгадовай працы, удзелу ў алімпіядах усіх узроўняў, падтрымкі настаўнікаў і асабістага захаплення пытаннямі, якія датычацца сучасных праблем чалавецтва.



### СУР'ЁЗНЫ ІСПЫТ

Міжнародная геаграфічная алімпіяда iGeo-2025 сёлета праходзіла ў Бангкоку і сабрала 180 маладых людзей з 47 краін. Разам з Мікалаем нашу краіну прадстаўлялі Аляксей Клімко (сярэбраны прызёр, сярэдняя школа № 118 г. Мінска імя К. К. Ракасоўскага), а таксама Елізавета Цоўка (гімназія № 1 імя абаронцаў Брэсцкай крэпасці) і Аляксандр Шалкоўскі (Магілёўскі дзяржаўны абласны ліцэй № 1). Кіраўнікамі каманды былі першы прарэктар БДУ Дзмітрый Курловіч і дэкан факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі Алена Кальмакова. Выкладчыкі рыхтавалі ўдзельнікаў да інтэлектуальных іспытаў, суправаджалі каманду ў Тайландзе, ствараючы надзейны тыл для кожнага са спаборнікаў.

Сам конкурс складаўся з трох тураў: тэарэтычнага, практычнага і мультымедыйнага. У першым вучні выконвалі заданні, звязаныя з глабальнымі праблемамі і прыроднымі з'явамі: апоўзнямі, спажываннем энергарэсурсаў, міграцыйнымі крызісамі, эфектам «гарадскога вострава цяпла» і іншымі. Заданні патрабавалі глыбокага разумення прыродных працэсаў, а таксама ўмення працаваць са статыстыкай, картамі і спадарожнікавай інфармацыяй.

Практычны тур алімпіяды ўключаў два асноўныя этапы: палявы і камеральны. Спачатку ўдзельнікі выязджалі на востраў Ко Крэт на рацэ Чаўпхрая (на ўскрайку Бангкока), дзе праводзілі даследаванне землекарыстання на пэўным участку тэрыторыі. Акрамя гэтага, неабходна было ацаніць турыстычны патэнцыял мясцовасці, вызначыць лакальныя асаблівасці, вывучыць расліннасць і г. д. На другім этапе — камеральным — удзельнікі апрацоўвалі сабраныя матэрыялы, прапаноўвалі ідэі па вырашэнні выяўленых праблем. Адзін з самых складаных элементаў праграмы — мультымедыйны тэст, у якім было 40 пытанняў па розных цяжкасцях геаграфіі. І з усімі заданнямі Мікалай паспяхова справіўся.

Дарэчы, асаблівасць міжнародных геаграфічных алімпіяд — усе англамоўныя матэрыялы падаюцца без перакладу, што стварае дадатковыя складанасці для ўдзельнікаў і патрабуе высокага ўзроўню падрыхтоўкі, у тым ліку і ў частцы валодання замежнай мовай.

**Міжнародная алімпіяда патрабуе ад удзельнікаў не толькі ведаў, але і гнуткасці мыслення, умення прымаць рашэнні ва ўмовах абмежаванага часу. Маладыя беларусы годна паказалі сябе ва ўсіх турах, праявіўшы як акадэмічную падрыхтоўку, так і ўпэўненасць у сваіх сілах. А Мікалай Місіюк стаў сапраўдным героем спаборніцтваў, якім па праве можа ганарыцца ўся краіна.**

### ЯК УСЁ ПАЧЫНАЛАСЯ...

Вядома, за поспехамі юнака стаяць падтрымка бацькоў і вялікая праца настаўнікаў гімназіі. Вось што расказала яго **выкладчыца па геаграфіі Юлія БАГДАСАРАВА:**

— З Мікалаем мы з пятага класа. Тады прадмет называўся «Чалавек і свет», і ўжо ў той час было бачна, што хлопчык мае асаблівы падыход да вучобы, глыбокую цікавасць да навакольнага свету. Пачынаючы з сёмага класа, Мікалай актыўна ўдзельнічае і перамагае ў алімпіядах па геаграфіі. Спачатку гэта былі лакальныя спаборніцтвы, потым узровень паступова павышаўся. З кожным годам хлопец удасканальваў свае веды і навыкі, не баяўся новых выклікаў. У дзявятым класе ён атрымаў дыплом другой ступені на рэспубліканскай алімпіядзе. Наступным крокам стала перамога ў дзясятым класе, калі вучань узяў дыплом першай ступені і трапіў на міжнародную алімпіяду.

Юлія Віктараўна адзначыла, што юнак мае даволі грунтоўны досвед міжнародных спаборніцтваў. Так, у мінулым годзе ён стаў абсалютным пераможцам Еўрапейскай геаграфічнай алімпіяды ў Сербіі, ёсць у яго і сярэбраны медаль Міжнароднай геаграфічнай алімпіяды ў Ірландыі. А вось цяпер як заканамерны вынік паступовага развіцця Мікалая — трыумф на міжнародным узроўні ў Тайландзе. І гэта сапраўды так.

— Хлопец — прыклад таго, як настойлівасць і любоў да вучобы могуць прывесці да вялікіх поспехаў. Гэта той выпадак, калі асабістыя інтарэсы і прафесійныя планы цалкам супадаюць, — падкрэслівае педагог.

А яшчэ трэба дадаць, што перамога Мікалая Місіюка — гэта яшчэ і перамога ўсёй нашай сістэмы адукацыі, якая, захаваўшы лепшыя традыцыі савецкага часу і стварыўшы свае, рыхтуе сапраўдных прафесіяналаў і, што надзвычай важна, сапраўдных патрыётаў.

**Міхаіл ДАНІЛКОВІЧ.**

# РАДЫ ДАПАМАГЧЫ!

### 18 ТЫСЯЧ «КВАДРАТАЎ», 84 КАБІНЕТЫ...

Школа знаходзіцца ў мікрараёне Альшанка, адным з самых вялікіх у Гродне. Па меры яго развіцця з'яўляліся новыя сацыяльна значныя аб'екты, адкрыццю школ тут заўсёды былі рады. СШ № 41 расчыніла дзверы перад вучнямі ў 2019 годзе і з'яўляецца адной з самых буйных не толькі ў горадзе, але і ў вобласці. У новым навучальным годзе тут плануюць атрымліваць веды 4000 чалавек, якія вучацца ў дзве змены. Класы вялікія (сярэдняя напаўняльнасць — 28 чалавек), навучаюцца на некалькіх паралелях, напрыклад, у 5 і 7 класах сфарміравана 17 навучальных груп. Усяго сфарміравана 134 клас-камплекты.

Штогод па заканчэнні навучальнага года перад калектывам адкрываецца вялікі фронт работ, бо плошча школы большая за 18 000 $м^2$, а навучальны фонд — 84 кабінеты. Акрамя гэтага, установа адукацыі мае вялікую тэрыторыю: ёсць басейн, сталовая на 450 пасадачных месцаў. **Дырэктар школы Алена ШЭЎЧЫК** адзначае, што школа з усім спраўляецца дзякуючы згуртаванаму калектыву і ініцыятыўным бацькам, якія з вялікім задавальненнем прымаюць удзел у жыцці ўстановы адукацыі.

— У гэтым плане нам вельмі пашанцавала. Бацькі адказныя, лёгкія на пад'ём. Напрыклад, мы арганізавалі акцыю «Выгадуй кветку». Прапанавалі дзецям і бацькам разам вырасціць кветачкі, якія потым былі б высаджаны на тэрыторыі школы. Гэта ініцыятыва была рэалізавана ў рамках Года добраўпарадкавання. Сёлета на тэрыторыі школы таксама з'явіліся новыя архітэктурныя формы. Калі нехта з дарослых умее праводзіць рамонтныя работы — прапануе дапамогу: штосьці пафарбаваць, паправіць, прыбраць. Акрамя таго, школа мае рахунак, на які можна адправіць ахвяраванні. Маці і таты ахвотна адгукнуліся, усе сабраныя сродкі пайшлі на рамонт. Вядома, вялікую ролю адыграла і бюджэтнае фінансаванне, але тым не менш вельмі прыемна, што і бацькі не засталіся ўбаку. Яны яшчэ і крэатыўныя. У нашай сталовай ёсць вітамінная зона, дызайн якой распрацавала маці аднаго з вучняў. У мінулым годзе бацькі выпускнікоў падаравалі ў актавую залу дадатковае асвятляльнае абсталяванне.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### ДОБРЫ ПРЫКЛАД ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

Як адзначыла **лабарант СШ № 41 і маці другакласніцы Вольга ГЕДЗІЧ,** удзельнічаць у жыцці школы трэба яшчэ і для таго, каб даваць прыклад дзецям. Бо яны вучацца, гледзячы на дарослых. Толькі на сваім асабістым прыкладзе можна паказаць, што добра, а што дрэнна.

— Да таго ж важна, у якіх умовах вучацца нашы дзеці. За навучальны год нешта страчвае прэзентабельны выгляд, здараюцца паломкі. Мы ўсе разам дапамагаем, працуем. І потым, калі бачым вынік працы, адчуваем гонар. Кожны разумее, што школа вельмі вялікая, і ўсё паспець да пачатку навучальнага года складана. Таму рады дапамагчы, — падзялілася Вольга.

У асноўным будынку патрабаваўся касметычны рамонт: неабходна прыбраць сколы, недзе нешта падфарбаваць. Таксама трэба правесці генеральную ўборку, каб усё было чыста і акуратна. На дадзены момант работы знаходзяцца на завяршальнай стадыі: адрамантаваны 84 навучальныя памяшканні. У трох кабінетах пачатковай школы за кошт уласных сродкаў абнавілі вучнёўскую мэблю. А за кошт бюджэтных сродкаў закупілі яшчэ 80 камплектаў вучнёўскай мэблі.

— У гэтым годзе атрымалі яшчэ адну лінію раздачы ў харчаблок, набылі яе за кошт гарадскога бюджэту. У хуткім часе будзе дастаўлена транспарціровачная стужка для збору бруднага посуду, набытая пры дапамозе мясцовых улад. У планах закупіць два маразільныя куфры і дзве электрапліты пры падтрымцы бюджэту. За кошт уласных сродкаў абнавілі камп'ютарныя крэслы, мышкі і клавіятуры ў камп'ютарным класе, — расказала Алена Шэўчык. Дырэктар дадала, што ў школе пашыраецца інклюзіўнае асяроддзе, каб любое дзіця магло бесперашкодна атрымліваць веды. Гэтыя ініцыятывы таксама рэалізуюцца дзякуючы падтрымцы гарадскіх улад.

### ПРАЦОЎНАЕ ЛЕТА

Удзел у добраўпарадкаванні школы бяруць не толькі бацькі, але і дзеці, якія працуюць у перыяд летняй занятасці школьнікаў. Як расказала дырэктар, сёлета хлопчыкі і дзяўчынкі актыўна ўдзельнічалі ў рамонтных работах і добраўпарадкаванні школы. Летам былі арганізаваны 4 працоўныя брыгады па 25 чалавек кожная. Акрамя таго, працаваў яшчэ лагер працы і адпачынку, дзе дзеці змаглі не толькі папрацаваць, але і аздаравіцца.

У дзень, калі я наведвала школу, там шчыравалі вучні. Яны з цікавасцю расказвалі пра працоўныя будні. **Валерыя Амбражэвіч** перайшла ў 9 клас. Яна падзялілася, што праца дапамагла ёй атрымаць новыя навыкі і знайсці сяброў:








— Калі шчыра, хацелася зарабіць свае першыя грошы. Але разам з гэтым я была рада дапамагчы школе, зрабіць яе лепшай напярэдадні новага навучальнага года. На працу ўладкавалася ўпершыню: аб такой магчымасці расказала настаўніца, і я без разважанняў вырашыла папрацаваць. Думаю, за гэты час стала больш дарослай. У наступным годзе яшчэ папрацую.

Не менш эмоцый і ў дзевяцікласніцы **Кіры Малахінскай,** якая таксама працавала летам упершыню:

— Мы даглядаем кветкі, праводзім уборку, дапамагалі ў бібліятэцы. Гэта вельмі цікавы досвед. Праца дазваляе адчуць сябе дарослай. Будзе прыемна атрымаць свой першы заробак: планую купіць вінілавую пласцінку. Яна будзе для мяне асабліва каштоўнай, бо я сама на яе зарабіла.

Да працоўнага лета далучыўся і **Ярослаў Жывушка,** які таксама перайшоў у 9 клас:

— Пра падпрацоўку бацькі падказалі, мне ідэя спадабалася. У нас цудоўная брыгада. І вельмі здорава дапамагчы школе, у якой сам вучышся. У першы дзень было нязвыкла і незразумела, але ўжо на другі ўцягнуўся ў працу. Вядома, чакаю сваю першую зарплату, планую выдаткаваць яе на падрыхтоўку да 1 верасня.

Калектыў у школе малады, сярэдні ўзрост — 35 гадоў. Штогод яго шэрагі папаўняюць маладыя спецыялісты, у мінулым годзе іх было 17. У гэтым таксама чакаецца папаўненне. Дырэктар адзначае, што маладым педагогам дапамагаюць старэйшыя калегі, працуе сістэма настаўніцтва. Такім чынам, школа гатова сустрэць новы навучальны год!

**Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ,**
**фота аўтара.**


ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении **25 августа 2025 года**
повторных торгов
с условиями по продаже имущества,
принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| Предмет торгов |
|---|
| Капитальное строение с инв. № в ЕГРНИ 600/С-122808, общей площадью 24,4 кв. м (наименование: помещение насосной станции мазута; составные части и принадлежности: кирпичное здание помещения насосной станции мазута 3А1/к, с резервуарами под мазут а1) |
| Сведения о земельном участке: площадь – 0,0774 га, кадастровый номер – 623650100001005578 |
| Местонахождение: Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Заводская, 17/3 |
| Начальная цена: 100 000,00 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка: 10 000,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г.Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, кодификатор назначения платежа – 40901, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **25 августа 2025 года в 11.30** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов).

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 04.08.2025 по 22.08.2025** включительно, в рабочие дни – с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**По вопросу осмотра объекта следует обращаться по телефону: (017) 388-43-21.**

**Телефоны для справок:**
**(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).**



**ЗАО «Центр промышленной оценки»** (УНП 191021390) – проводит электронные торги (оператор ЭТП – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638) по продаже **спецтехники, бывшей в употреблении**, принадлежащей **Смолевичскому лесхозу** (УНП 600023997)

| Предмет электронных торгов |
|---|
| **Трактор «Беларус» 82.1, КА 2843**, 2009 г. в. Месторасположение: г. Смолевичи, ул. Торговая, 41. **Начальная цена с НДС 20 % – 18 000,00 бел. руб.** |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 11.10 02.09.2025. Дата и время окончания приема заявок:** по **01.09.2025,** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by |
| **Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайте Государственного комитета по имуществу** |
| **Контактные данные: +375 (17) 310-36-37; +375 (44) 704-92-06; auction@cpo.by** |

НА КАНТРОЛІ

# КАБ НЕ АТРУЦІЦЬ СВАЁ ЛЕТА

## Якія парушэнні ў гандлі прадуктамі самыя распаўсюджаныя?

Каб засцерагчы сябе ад няякаснай садавіны і гародніны ўлетку, варта выконваць некалькі простых правіл: купляць прадукты ў правераных месцах, выбіраць якасныя плады без пашкоджанняў і падазронага паху, старанна мыць іх перад ужываннем і выконваць рэкамендацыі па захоўванні. Праўда, часам даводзіцца чуць нараканні на няякасную плодаагародніннную прадукцыю ў той ці іншай гандлёвай сетцы ці краме — як у сталіцы, так і ў аддаленых пунктах краіны. Сёлета асаблівую ўвагу ў Мінску аддалі праверцы ларкоў з гароднінай і фруктамі. Расказваем, якія парушэнні ў іх, а таксама іншых гандлёвых аб'ектах самыя распаўсюджаныя і чаму пакупніку не трэба спяшацца пісаць скаргу, а спачатку лепш паспрабаваць вырашыць сітуацыю з самой крамай.

### ТАВАР НА ПАДЛОЗЕ

Як расказала **начальнік галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Алена НАГОРНАЯ**, за першае паўгоддзе Мінгарвыканкамам праведзены абследаванні і маніторынгі больш як адной тысячы аб'ектаў. Яны праводзяцца сумесна з Мінскім гарадскім цэнтрам гігіены і эпідэміялогіі, улічваючы, што тыповыя парушэнні ў асноўным — гэта парушэнні санітарна-эпідэміялагічнага заканадаўства.

— Сапраўды, вынікі былі, напэўна, чаканымі, з улікам таго, што арганізацыю нестацыянарных аб'ектаў забяспечваюць альбо юрыдычныя асобы са штатам у тры-чатыры чалавекі, альбо індывідуальныя прадпрымальнікі. Парушэнняў было даволі шмат. Выдалі рэкамендацыі, парушэнні ліквідаваны, але кантроль трэба працягваць, таму што з вясны да восені — самы актыўны перыяд іх работы, — адзначыла Алена Нагорная, дадаўшы, што і размяшчэнне такіх гандлёвых палатак садзейнічае таму, што праз іх праходзіць вялікая колькасць пакупнікоў. Гэта ў асноўным прыпынachныя пункты ў густанаселеных раёнах Мінска.

У асноўным, па словах начальніка галоўнага ўпраўлення, парушэнні датычацца адсутнасці дакументацыі аб паходжанні тавару, а таксама ўмоў захоўвання, нягледзячы на тое, што гэта нестацыянарны аб'ект. Мінгарвыканкам у гэтым паўгоддзі будзе больш шчыльна працаваць з аб'ектамі, якія яму падпарадкоўваюцца, а таксама з аб'ектамі, якія не маюць пашыранай буйной сеткі.



Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю ў сваю чаргу ў першым паўгоддзі правяло кантрольна-аналітычныя мерапрыемствы ў больш як 4,4 тысячы аб'ектаў гандлю. З іх 3,3 тысячы правераны на выкананне заканадаўства аб абароне правоў спажыўцоў і гандлю.

— Калі браць парушэнні, звязаныя з рэалізацыяй тавараў са скончаным тэрмінам прыдатнасці, то па гэтых фактах за першае паўгоддзе было выдадзена 234 прадпісанні. Адказнасць дастаткова сур'ёзная — да 100 базавых велічынь (4200 рублёў) на юрыдычную асобу. Але ёсць парушэнні, якія звязаны з маркіроўкай, калі тавар сапраўды знаходзіцца яшчэ ў межах тэрміну прыдатнасці, але проста не даведзена інфармацыя аб гэтым. У такім выпадку суб'ект гаспадарання, дапаўняючы або карэкціруючы інфармацыю, якая знаходзіцца на тавары, у далейшым можа спакойна яе рэалізоўваць, — звярнуў увагу **начальнік галоўнага ўпраўлення МАРГ па Мінску Кірыл СЛАБКО**.

### АСЦЯРОЖНА З САЛАТАМІ І СУШЫ

Пры гэтым, як адзначыла Алена Нагорная, сённяшняе заканадаўства пабудавана такім чынам, што дае магчымасць пры адзінкавым парушэнні выправіць яго і працягваць работу.

— Да кантролю актыўна далучаюцца спажыўцы, у тым ліку і праз інтэрнэт: здымаюць ролікі — часта аб'ектыўныя, а часта і вельмі суб'ектыўныя. Але сёння да аб'ектаў гандлю найчасцей прымяняюцца прафілактычныя меры. Калі, умоўна кажучы, у прадаўца адсутнічае бэйдж, мы ўкажам на гэтае парушэнне і яно будзе выпраўлена, тут няма падстаў штрафаваць. На жаль, спажыўца не заўсёды задавальняе прафілактычная мера, ён патрабуе пакараць суб'ект гандлю. Даводзіцца тлумачыць, што заканадаўства дае магчымасць суб'екту, выправіўшы парушэнне, выбудаваць сваю работу належным чынам, — растлумачыла Алена Нагорная.

Не спяшацца пісаць скаргу, а спачатку наладзіць дыялог з крамай, параіла і **загадчык аддзялення гігіены харчавання Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ірына ДАЛАКІШВІЛІ**.

— Суб'екту гандлю варта даць магчымасць прыняць меры па ліквідаванні недахопаў, а калі ўжо гэта не спрацоўвае, то тады звяртацца ў кантрольныя органы. Сёння ёсць шырокія магчымасці, каб прыцягнуць да адказнасці суб'ект гандлю, — адзначыла Ірына Далакішвілі, дадаўшы, што значныя аб'ёмы прадукцыі, якая не адпавядае нормам, канфіскуюцца і ўтылізуюцца.

У прыватнасці, з пачатку гэтага года толькі ў лабараторыі Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі было даследавана больш за 1,6 тысячы проб харчовых прадуктаў. З іх, як праінфармавала **загадчык аддзялення гігіены харчавання аддзела гігіены Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Вольга ЦІМАШЭНКА**, 14 % не адпавядала нормам па тых або іншых паказчыках. Уся небяспечная і з адхіленнямі прадукцыя выключана з рэалізацыі і ўтылізавана. Што ж датычыцца гандлю, выяўляюцца неадпаведныя тавары як заводскай, імпартнай вытворчасці, так і ўласнай. Пераважна гэта шматкампанентныя салаты, сушы, прадукцыя, дзе шмат ручной работы.

**Алена КРАВЕЦ.**


## Извещение о проведении 25 августа 2025 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| Предмет торгов |
|---|
| Капитальное строение с инв. номером 630/С-47149 общей площадью 647,0 кв. м (наименование – Административное здание; назначение – здание административно-хозяйственное; составные части и принадлежности: бетонный подвал); капитальное строение с инв. номером 630/С-47154 общей площадью 397,2 кв. м (наименование – Склад материальный; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ); капитальное строение с инв. номером 630/С-47152 общей площадью 222,7 кв. м (наименование – Склад для горюче-смазочных материалов; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ); капитальное строение с инв. номером 630/С-47155 общей площадью 743,1 кв. м (наименование – Боксы для автомашин с пристройкой подсобных помещений; назначение – здание специализированное иного назначения); капитальное строение с инв. номером 630/С-47160 общей площадью 1960,9 кв. м (наименование – Ремонтные мастерские; назначение – здание специализированное иного назначения); капитальное строение с инв. номером 630/С-47158 общей площадью 1360,7 кв. м (наименование – Пристройка к реммастерским; назначение – здание специализированное иного назначения); капитальное строение с инв. номером 630/С-47156 общей площадью 1123,1 кв. м (наименование – Боксы для автомашин; назначение – здание специализированное иного назначения); капитальное строение с инв. номером 630/С-55558 общей площадью 35,0 кв. м (наименование – Навес под баллоны; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ); капитальное строение с инв. номером 630/С-55622 (наименование – Ограждение; назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: а1 – ограждение из силикатного кирпича (1,95 м х 2,34 м х 0,25 м), площадью 4,6 кв. м); капитальное строение с инв. номером 630/С-55620 (наименование – Ограждение; назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: а1 – ограждение из металлической арматуры (21,0 м х 2,69 м), площадью 56,5 кв. м, на металлических столбах (0,1 м х 2,60 м); капитальное строение с инв. номером 630/С-55611 (наименование – Ограждение; назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: а1.1. – ограждение из силикатного кирпича (13,94 м х 2,85 м х 0,25 м), 39,7 кв. м, а1.2. – ворота металлические (4,07 м х 2,85 м); капитальное строение с инв. номером 630/С-55610 (наименование – Ограждение; назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: а1 – ограждение бетонное (97,5 м х 1,71 м), 166,7 кв. м с 31 кирпичными столбиками с бетонными оголовками; а.1.1. – металлическая решетка (1,50 м х 1,97 м), 41,37 кв. м; а2 – ворота металлические (5,96 м х 3,70 м), 22,1 кв. м; а2.1. – калитка металлическая (1,62 м х 2,30 м), 3,73 кв. м); капитальное строение с инв. номером 630/С-55608 общей площадью 7260,0 кв. м (наименование – Площадка; назначение – сооружение неустановленного назначения; составные части и принадлежности: а1 – площадка из асфальтобетона); капитальное строение с инв. номером 630/С-55607 общей площадью 465,0 кв. м (наименование – Площадка; назначение – сооружение неустановленного назначения; составные части и принадлежности: а1 – площадка из бетонной плитки); оборудование котельной с инв. номером 146 (котел КВЖ-02, 2 шт.; циркуляционный насос, 4 шт.; бойлер 10 куб. м, 1 шт.; топливопровод 20 м; щит управления) |
| Сведения о земельном участке: площадь – 1,331 га, кадастровый номер – 642000000002000230 |
| Местонахождение: Минская область, Молодечненский район, г. Молодечно, ул. Замковая, 33 |
| Начальная цена: 1 363 662,00 бел. руб. без учета НДС |
| Сумма задатка: 136 000,00 бел. руб. |
| Обременение: аренда |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Условие торгов:** Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, кодификатор назначения платежа – 40901, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **25 августа 2025 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с **04.08.2025 по 22.08.2025** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**По вопросу осмотра продаваемого имущества следует обращаться по телефонам: (017) 388-43-21; (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).**

**Телефоны для справок: (017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 388-43-21; (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).**

# МЕДЫКІ З НОВАГА ПАПАЎНЕННЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У параўнанні з мінулым годам у арганізацыі аховы здароўя прыбудзе амаль на 10 % больш маладых медыкаў. Сярод сацыяльных гарантый, якія належаць маладому спецыялісту, шэраг выплат, у тым ліку аднаразовая грашовая дапамога, дапамога на пераезд (калі спецыяліст размеркаваны не па месцы жыхарства), а таксама штомесячныя стымуляцыйныя выплаты, якія ў сістэме аховы здароўя складаюць ад 20 % да 50 % ад акладу. Акрамя гарантаваных дзяржавай бонусаў, наймальнікі і мясцовыя ўлады па-свойму заахвочваюць маладых спецыялістаў. Паглядзелі, як сёлета з гэтым справы на месцах.

## НЯСВІЖ: НЕ ТОЛЬКІ РАБОТА, АЛЕ І КУЛЬТУРНЫ ВОЛЬНЫ ЧАС

У Нясвіжскай цэнтральнай раённай бальніцы сёлета пачнуць працаваць чатыры ўрачы-спецыялісты, тры ўрачы-інтэрны для праходжання інтэрнатуры па агульнай урачэбнай практыцы і сем медыцынскіх сясцёр. У першы працоўны дзень на першым працоўным месцы іх урачыста сустрэлі: павіталі маладых дактароў і медсясцёр разам з кіраўніцтвам ЦРБ прыйшло і кіраўніцтва раёна. Акрамя стандартных надбавак, маладыя людзі, якія прыбылі ў раённы цэнтр на першае рабочае месца, будуць забяспечаны жыллём.

— Прапануем або арэнднае жыллё, або кампенсуем да 5 базавых велічынь, калі спецыяліст вырашыў арандаваць кватэру. Таксама прапануем пакоі і ложка-месцы ў інтэрнаце. Маецца ў нас і кватэра, якую сёлета якраз зойме адзін з маладых спецыялістаў, — расказвае **галоўны ўрач Нясвіжскай цэнтральнай раённай бальніцы Вікторыя ПРАЖЭНІК.**

Акрамя таго, падчас работы ў маладых медыкаў ёсць магчымасць удасканальвацца ў прафесіі — прайсці курсы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўку.

— Калі ёсць неабходнасць у змене першапачатковага месца работы, маецца патрэба ў пэўных спецыялістах, мы накіроўваем урача на перападрыхтоўку. Напрыклад, наш малады хірург выказала жаданне прайсці перападрыхтоўку на эндаскапіста.

Зазвычай ёсць магчымасць у маладых спецыялістаў і падзарабіць. Гэта і дзяжурствы ў прыёмным аддзяленні, а таксама работа ў святочныя і выхадныя дні. Кругласутачныя дзяжурствы арганізаваны для тэрапеўтаў, хірургаў, анестэзіёлагаў-рэаніматолагаў, педыятраў і акушэраў-гінеколагаў.

А каб маладыя медыкі з першых тыдняў адчувалі сябе ў новым калектыве як дома, ім прапануюць удзельнічаць у шматлікіх культурна-масавых мерапрыемствах. У жніўні—верасні, напрыклад, у Нясвіжы праходзіць раённы турыстычны злёт, прафсаюзная арганізацыя набывае білеты на канцэрты, экскурсіі. Па традыцыі восенню ЦРБ праводзіць «Пасвячэнне ў прафесію» — конкурс, дзе маладыя спецыялісты павінны прадэманстраваць сваю тэарэтычную падрыхтоўку, а медсёстры — і практычныя навыкі. А таксама прэзентаваць сябе — расказаць, чаму абралі медыцыну, і падзяліцца ўражаннямі ад першых крокаў у прафесіі. А ў завяршэнні ўсе маладыя людзі атрымліваюць падарункі і сувеніры.



**Злева направа: Арына ШЫДЛОЎСКАЯ, медыцынская сястра кабінета фільтра, Валерыя ДАНІЛЕВІЧ, медыцынская сястра стаматалагічнага аддзялення, Лізавета ЦЫКУНОВА, урач-стаматолаг-тэрапеўт, Ілля КРАЎЦОЎ, урач-траўматолаг-артапед, Злата Андрэеўна БОЙКА, фельдшар-лабарант, Аліна МІСЬКО, сястра медыцынскага пункта для аказання мед. дапамогі навучэнцам дзіцячых дамоў, Наталля Канстанцінаўна КРУЛЬ, урач функцыянальнай дыягностыкі (загадчык) кабінета функцыянальнай дыягностыкі 25-й гарадской дзіцячай паліклінікі Мінска.**

## СЛОНІМ: ПАДЗАРАБІЦЬ НА ВЫСОКАТЭХНАЛАГІЧНЫХ АПЕРАЦЫЯХ

Слонімская ЦРБ сёлета папоўнілася 28 маладымі дактарамі і медсёстрамі. Усім з іх, хто мае патрэбу, прапануюць арэнднае жыллё.

— Летась восем нашых супрацоўнікаў атрымалі арэндныя кватэры, сёлета — яшчэ столькі ж. У канцы жніўня будаўнікі здаюць яшчэ адзін дом з арэндным жыллём, таксама будзем прапаноўваць тым, хто мае патрэбу, — адзначае **галоўны ўрач Слонімскай цэнтральнай раённай бальніцы Наталля РЫЗВАНОВІЧ,** дадаючы, што, калі малады спецыяліст здымае жыллё, па дагаворы найму яму кампенсуюць частку сродкаў.

Калі медык пасля абавязковага тэрміну адпрацоўкі вырашае застацца на першым рабочым месцы, пры падаўжэнні кантракта атрымлівае дадатковую выплату ў 20 базавых велічынь. Падчас адпрацоўкі маладыя спецыялісты павышаюць сваю кваліфікацыю на адпаведных курсах. Нярэдка прымаюць рашэнне абраць больш вузкую спецыялізацыю. Напрыклад, з агульнай урачэбнай практыкі пераходзяць у дыягнастычныя спецыялізацыі, эндакрыналогію, уралогію і кардыялогію.

— Мы вітаем, калі маладыя спецыялісты выказваюць жаданне ўдзельнічаць у высокатэхналагічных умяшаннях, за гэта прадугледжана заахвочванне, — кажа Наталля Рызвановіч. — Зрэшты, як і за актыўны ўдзел у грамадскім жыцці.

## ОРША: МАГЧЫМАСЦІ ДЛЯ ЎДАСКАНАЛЕННЯ

У Аршанскай гарадской бальніцы № 1 імя Сямашкі сёлета сустрэлі восем новых дактароў і 24 прадстаўніцы сярэдняга медыцынскага персаналу. **Загадчык бальніцы Вольга ПЯТРАШКА** асабіста напярэдадні сустрэлася з усімі маладымі спецыялістамі і паказала іх першыя рабочыя месцы.

— Урачу-рэнтгенолагу я прапанавала ў будучыні прайсці падрыхтоўку і працаваць не толькі на рэнтгенаўскім, але і на апаратах КТ і МРТ. Яна аршанка, у жыллі патрэбы не мае. Пяці маладым дактарам анестэзіёлагам-рэаніматолагам паказалі нашу рэанімацыю, прапанавалі развівацца ў кірунках як анестэзіялогіі, так і рэанімацыі. Адзін малады чалавек прыехаў да нас з Віцебска, другі — з Гомеля, таму прапанавалі ім арэнднае жыллё. Прыйшлі да нас урач-отарыналарынголаг і ўрач-неўролаг. Апошняй на выбар прапанавалі працаваць у аддзяленні інсультаў ці аддзяленні агульнай неўралогіі, яна выбрала другое, бо жадае практыкавацца ў лячэнні рассеянага склерозу, — расказала Вольга Пятрашка, падкрэсліўшы, што за ўсімі маладымі спецыялістамі замацаваны настаўнікі — загадчыкі аддзяленняў, якія маюць вышэйшую ці першую кваліфікацыйную катэгорыю.

Пастараліся ўлічыць і ўсе пажаданні медыцынскіх сясцёр, якія ў якасці першых рабочых месцаў абралі апераблок, рэанімацыйнае, а таксама аддзяленні неўралогіі, хірургіі і траўматалогіі, лабараторыю.Тым, хто мае патрэбу, дадуць інтэрнат.



**Лізавета ЦЫКУНОВА,урач-стаматолаг-тэрапеўт, Валерыя ДАНІЛЕВІЧ, медыцынская сястра стаматалагічнага аддзялення 25-й гарадской дзіцячай паліклінікі Мінска.**

## МІНСК: АД МАТДАПАМОГІ ДА ДАДАТКОВАГА ВОДПУСКУ

25-я гарадская дзіцячая паліклініка 1 жніўня гасцінна сустрэла 2 урачоў-інтэрнаў, урача-стаматолага і ўрача-артапеда, а таксама 4 медыцынскія сястры. Як расказала **галоўны ўрач паліклінікі Ганна МАЖАКА,** акрамя агульных гарантый і льгот, згодна з калектыўным дагаворам, маладыя спецыялісты маюць права на некаторыя іншыя выплаты, напрыклад, штогадовую матэрыяльную дапамогу, выплату да сямі базавых велічынь пры будаўніцтве індывідуальнага жылля, дадатковы заахвочвальны водпуск працягласцю да 5 дзён, кампенсацыю часткі грашовых сродкаў за найманне жылля.

**Алена КРАВЕЦ.**
**Фота Канстанціна ДРОБАВА.**

## У тэму

### Універсітэт пракантралюе наймальнікаў

Гатоўнасць першых працоўных месцаў для маладых медыкаў і месцы іх пражывання напрыканцы ліпеня кантралявала і кіраўніцтва медыцынскіх ВНУ. Напрыклад, прадстаўнікі адміністрацыі Віцебскага дзяржаўнага медуніверсітэта на чале з рэктарам Аляксеем Чуканавым з гэтай мэтай традыцыйна наведалі медустановы Магілёўскай вобласці. Падчас візіту яны сустрэліся і з працуючымі маладымі спецыялістамі, абмеркаваўшы пытанні адаптацыі, сацыяльна-бытавой і прававой падтрымкі медыкаў, прафесійнага развіцця і падтрымкі з боку ўніверсітэта.


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

**Организатор электронных торгов:** Открытое акционерное общество «Борисовдрев», 222520, Минская область, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 18, тел. 80177758531.
**Оператор электронной торговой площадки:** ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».

**Торги проводятся 21.08.2025** на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество», **www.et.butb.by. Время торгов** устанавливается инструментарием площадки в автоматическом режиме.

| № лота | Наименование предмета торгов; его местонахождение | Краткая характеристика | Начальная цена лота, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальные строения (административное здание № 1, механические мастерские с тамбуром, уборная на Л/П, склад з/частей на автобазе, пожарный пост, архив, мастерская для плотницких работ, мастерские кирпичные, котельная с душевой, гараж со сварочным постом, склад кирпичный, столовая); Минская обл., Логойский р-н, Плещеницкий с/с, г.п. Плещеницы, ул. Октябрьская, 47, 47Б | Производственная база в составе: административное здание № 1 с элементами благоустройства, сетью водопровода и сетью электроснабжения (601/С-34904, 149,3 кв. м, составные части: две пристройки), механические мастерские с тамбуром (601/С-34903, 89,3 кв. м, составные части: тамбур), уборная на Л/П (601/С-34902, 7,5 кв. м), склад з/частей на автобазе (601/С-34901, 100,1 кв. м), пожарный пост (601/С-34900, 22,6 кв. м), архив (601/С-34899, 24,4 кв. м), мастерская для плотницких работ (601/С-34898, 51,1 кв. м), мастерские кирпичные (601/С-34897, 42,3 кв. м, составные части: навес), котельная с душевой (601/С-34896, 130,8 кв. м), гараж со сварочным постом (601/С-34895, 731,0 кв. м, составные части: мансардный этаж), склад кирпичный (601/С-14317, 47,7 кв. м), столовая (601/С-14308, 133,4 кв. м, составные части: холодильник, пищеблок, обеденный зал, буфет, холодная пристройка) | 100 128,00 | 10 012,80 |

**Продавец:** *ОАО «Борисовдрев», Минская обл., г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 18; тел. 80177739688.*

**Окончание приема заявлений на участие в торгах с прилагаемыми к ним документами** – 18.08.2025, до 15.00.

**Задаток** для участия в торгах перечисляется на текущий (расчетный) банковский счет № BY60AKBB30120000066940000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа». **Срок внесения задатка** – не позднее даты и времени окончания приема заявлений на участие в торгах. **Назначение платежа**: внесение суммы задатка для участия в электронных торгах рег. № ___ по заявлению № ___.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения электронных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608 и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».

**Сроки возмещение затрат на организацию и проведение торгов:** Победитель электронных торгов (претендент на покупку) в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах торгов обязан возместить затраты на организацию и проведение торгов, иные платежи, указанные в протоколе.

**Сроки и условия заключения договора:** Срок подписания договора купли-продажи имущества – не позднее 10 рабочих дней со дня возмещения вышеназванных затрат, иных платежей, указанных в протоколе о результатах торгов.

ЖАЛЕЗНАЕ БРАТЭРСТВА

# РАЗАМ ЗА СТАБІЛЬНАСЦЬ І БЯСПЕКУ

## Беларусь і Кітай супрацьстаяць гегемоніі, бясчынству і сілавому дыктату

Пад стратэгічным кіраўніцтвам Старшыні КНР Сі Цзіньпіна і Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі кітайска-беларускія адносіны ўсепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства дынамічна развіваюцца. Аб гэтым заявіў **аташэ па пытаннях абароны пры пасольстве КНР у Беларусі Лю Чжэ** на ўрачыстым мерапрыемстве з нагоды 98-годдзя з дня стварэння Народна-вызваленчай арміі Кітая.

Аташэ нагадаў, што ў чэрвені беларускі лідар здзейсніў пасляховы візіт у Кітай.

— Кіраўнікі дзвюх дзяржаў вызначылі новыя перспектывы развіцця адносін паміж Кітаем і Беларуссю. З радасцю адзначаю, што як важны складнік двухбаковых адносін сувязі паміж узброенымі сіламі Кітая і Беларусі бесперапынна паглыбляюцца, прыносяць важкі плён практычнага супрацоўніцтва, — адзначыў Лю Чжэ. Кітай цвёрда прытрымліваецца шляху мірнага развіцця і нязменна праводзіць абарончаю нацыянальную палітыку.

— З моманту заснавання КНР кітайская армія ніколі не ініцыявала ніводнага канфлікту і не ўрывалася ні на пядзю чужой тэрыторыі, — адзначыў аташэ.

Аташэ нагадаў, што сёлета спаўняецца 80 гадоў з дня Перамогі кітайскага народа ў Вайне супраціўлення японскім захопнікам і ў Другой сусветнай вайне, а таксама Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

— 80 гадоў таму нашы арміі поруч ваявалі супраць фашысцкіх агрэсараў, змагаваўшыся баявым брацтвам, — нагадаў Лю Чжэ. — А сёння кітайская армія гатовая разам з беларускай арміяй захоўваць урокі вайны, адстойваць гістарычную памяць і праўду, паглыбляць ваеннае супрацоўніцтва і сумесна супрацьстаяць гегемоніі, бясчынству і сілавому дыктату, уносячы яшчэ большы ўклад у абарону міру і стабільнасці ва ўсім свеце.

Народна-вызваленчая армія Кітая (НВАК) стала адной з самых магутных і тэхналагічных армій свету. Гэта адзначыў **міністр абароны Віктар ХРЭНІН.**

З першых дзён свайго існавання НВАК упісала ў гісторыю Кітая і ўсяго свету гераічныя старонкі мужнасці, самаахвяравання і бязмежнай адданасці Радзіме, — падкрэсліў Віктар Хрэнін. — Яна прайшла слаўны шлях ад абароны рэвалюцыйных заваёў да станаўлення адной з самых магутных, тэхналагічных і прафесійных армій свету, надзейнага гаранта суверэнітэту, тэрытарыяльнай цэласнасці і працвітання Кітая.

Як адзначыў міністр абароны, Беларусь высока цэніць ролю НВАК у падтрыманні глабальнай і рэгіянальнай стабільнасці.

Ён заявіў, што Беларусь мае цвёрды намер і ў далейшым паглыбляць і пашыраць плённае супрацоўніцтва з Народна-вызваленчай арміяй Кітая ва ўсіх сферах, якія ўяўляюць узаемную цікавасць.

— Мы ўпэўнены, што сяброўства і ўзаемадзеянне паміж Беларуссю і Кітаем будуць і надалей мацнець, уносячы ўклад у бяспеку нашых дзяржаў і народаў, а таксама падтрыманне міру на планеце, — перакананы кіраўнік абароннага ведамства.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**



МІЖНАРОДНЫ ВЕКТАР

# МІНСК — АПТЫМАЛЬНАЯ ПЛЯЦОЎКА ДЛЯ СУР'ЁЗНАЙ РАЗМОВЫ

## Беларусь заклікала краіны АБСЕ вярнуць мір у Еўропу з дапамогай дыпламатыі

Дэлегацыя Беларусі на чале з намеснікам міністра замежных спраў Ігарам САКРЭТАМ у Хельсінкі прыняла ўдзел у юбілейных мерапрыемствах, прысвечаных 50-годдзю падпісання Хельсінкскага заключнага акта, паведаміла БелТА.

Выступаючы на рабочых дыскусіях аб будучыні АБСЕ, кіраўнік беларускай дэлегацыі прадставіў ацэнкі і прапановы Мінска па пераадоленні крызіснай сітуацыі ў сферы рэгіянальнай бяспекі, а таксама па павышэнні эфектыўнасці работы АБСЕ.

Ігар Сакрэта падкрэсліў, што будучыня АБСЕ магчыма толькі ў тым выпадку, калі дзяржавы-ўдзельніцы пачнуць успрымаць арганізацыю не як пляцоўку для эмацыянальнага выказвання ўзаемных прэтэнзій, а як практычны інструмент прасоўвання дыялогу і ўмацавання міждзяржаўнага ўзаемадзеяння на ўсёй еўразійскай прасторы.

— Калі мы здолеем узняцца над ідэалагічнымі догмамі і забабонамі, мы зможам вярнуць мір у Еўропу. Як? Праз дыпламатыю. Спыненне ваенных дзеянняў і новая разрадка ў Еўропе стануць не перадумовай, а вынікам аднаўлення паўнацэнных міжнародных зносін, — адзначыў ён.

Беларускі бок прапанаваў пачаць абмеркаванне будучыні еўразійскай архітэктуры бяспекі, падкрэсліўшы неабходнасць абнаўлення дыялогу паміж зацікаўленымі дзяржавамі. У якасці прамежкавага кроку Беларусь выказалася за прыцягненне да абмеркавання незалежных экспертаў, аналітыкаў, вучоных і прадстаўнікоў СМІ — у выпадку, калі афіцыйныя структуры на першым этапе будуць не гатовы да прамога ўзаемадзеяння.

— Беларусь гатова да такога дыялогу ў любым фармаце і на любой пляцоўцы без папярэдніх умоў. Мы таксама прапануем выкарыстоўваць у гэтых мэтах Мінскую канферэнцыю па еўразійскай бяспецы, якая адбудзецца 28-29 кастрычніка. Улічваючы ўнікальнае геапалітычнае становішча нашай краіны, Мінск — аптымальная пляцоўка для сур'ёзнай размовы і выпрацоўкі рашэнняў па рэгіянальных канфліктах, — заявіў Ігар Сакрэта.

Таксама ў Хельсінкі намеснік міністра правёў сустрэчы з кіраўнікамі шэрагу замежных дэлегацый.


### ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Вилейский райагросервис»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1900 | Комбайн КЗС-1218-10, инв. № 3124т | 8976,00 | 897,60 | 448,80 |
| 1902 | Опрыскиватель «Мекосан» 2000-18, инв. № 3052А | 1632,00 | 163,20 | 81,60 |
| 1903 | Протравитель семян ПС-20, инв. № 3113 | 624,00 | 62,40 | 31,20 |

| Лот | Наименование | Земельный участок и местонахождение | Начальная цена без учета НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 2036 | Капитальное строение с инвентарным номером 631/С-62162 (назначение – Здание одноквартирного жилого дома, наименование – Здание одноквартирного жилого дома, общая площадь (протяженность) – 98,1 кв. м; составные части и принадлежности – Двухэтажный кирпичный жилой дом с гаражом, четырьмя сараями, навесом, уборной | Земельный участок с кадастровым номером 621384604101000110, для размещения объектов усадебной застройки (для обслуживания жилого дома), площадь – 0,1112 га (право аренды), расположенный по адресу: Минская обл., Вилейский р-н, Любанский с/с, д. Журихи, ул. Молодежная, 15 | 6940,00 | 694,00 | 347,00 |

В отношении лотов №№ 1900, 1902, 1903 проводятся восьмые повторные торги. **Стоимость снижена на 90 %.**
В отношении лота № 2036 проводятся шестые повторные торги. **Стоимость снижена на 80 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» от 15.07.2025

**Местонахождение лота № 1900:** Минская обл., Вилейский р-н, д. Шиловичи. **Местонахождение лотов №№ 1902, 1903:** Минская обл., Вилейский р-н, Любанский с/с, д. Журихи

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **15 августа 2025 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | **С 10.00 4 августа 2025 года до 16.00 13 августа 2025 года** |

**Условия для участия в торгах:**
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA 30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», ОАО «Вилейский райагросервис», проводимых 15.08.2025.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127.
Документы могут подаваться посредством направления почтой или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов).
По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании актов в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона.
**Вознаграждение аукциониста: по лотам №№ 1900, 2036 – 8 %, по лоту № 1902 – 9 %, по лоту № 1903 – 10 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться на странице лота на сайте https://orgtorg.by/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. По вопросу осмотра объектов обращаться по телефону: **+375299999112, Чеслав.** Дополнительная информация по лоту № 2036 по тел. **+375293058650, Алена.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи недвижимого имущества и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет.
При реализации НДС не начисляется на основании подп. 1.33 п. 1 ст. 118 Налогового Кодекса Республики Беларусь.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ОАО «Вилейский райагросервис» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375172552928 (222416, г. Вилейка, ул. 1 Мая, 105, УНП 600010756)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |



# Амерыканскі дзяржплан сусветнага маштабу



## Гандлёвае пагадненне Трампа з ЕС можа пахаваць свабодны рынак як паняцце

Зніміце капялюш, панове. Памянем рынак і свабодны гандаль. Яны ніколі не з'яўляліся ідэальнымі, але хоць бы імкнуліся да нейкіх ідэалаў. Сёння рынačныя адносіны мёртвыя. Не ў асобна ўзятай краіне — фактычна ва ўсім свеце. І ініцыятарам забойства свабоднай канкурэнцыі на міжнароднай арэне выступіў не Кітай, не глабальны Поўдзень ці Усход, а ЗША.

Знешнегандлёвая палітыка Дональда Трампа фактычна штурхае сусветную эканоміку да дзяржплана. Менавіта да таго, з чым фармальна заўжды змагаўся Вашынгтон. Яго знакамітыя гандлёвыя здзелкі прадугледжваюць квоты і на экспарт, і на імпарт знешнегандлёвым партнёрам. І яшчэ неліквід у нагрузку. Такі падыход немінуча выклікае эфект даміно. Зусім не здзіўлюся, калі праз два-тры гады ў вядучых заходніх эканамічных ВНУ будуць выкладаць цэнтралізаванае планаванне.

Не, знешне ўсё выглядае быццам бы нават вельмі прыстойна. Дональд Трамп не адмаўляе прыватную ўласнасць, ён не збіраецца нацыяналізаваць буйныя карпарацыі, адыходзіць ад асноў капіталізму... Але тым і адрозніваецца дзеючы амерыканскі прэзідэнт, што яго словы не маюць асаблівага значэння. Ён гаворыць адно, думае — зусім другое, а робіць — трэцяе. Таму пакінем за дужкамі рыторыку амерыканскага палітычнага лідара і паглядзім на вынікі яго паўгадавога кіравання.

Кульмінацыяй пакуль служыць гандлёвае пагадненне з Еўрапейскім саюзам. На мой погляд, у ім вельмі цікавыя дзве пазіцыі. Па-першае, квота на сталь і алюміній, выплаўленыя ў Старым Свеце. Усё, што вышэй за квоту, абкладаецца 50-працэнтнай пошлінай, якая фактычна з'яўляецца забароннай. Па-другое, абавязацельства ЕС набыць за тры гады ў Штатаў энерганосьбітаў не менш як на 750 мільярдаў долараў у грашовым эквіваленце або ў сярэднім на 250 мільярдаў долараў за год. Так сабе абавязацельства, скажу я вам, бо ўвесь імпарт прыроднага і звадкаванага газу, нафты ЕС складае каля 400 мільярдаў долараў. Значыць, ЗША жадаюць ні многа ні мала атрымаць практычна дзве трэці рынка імпарту энерганосьбітаў у Старым Свеце.

Размовы аб замяшчэнні расійскага газу і нафты, мякка кажучы, некарэктныя і спекулятыўныя. Вядома, РФ з'яўлялася да канфлікту ва Украіне буйным пастаўшчыком энерганосьбітаў у Еўропу. Але нават па газе займала долю ў раёне 35 % на максімуме развіцця супрацоўніцтва. Па нафце расійская доля на еўрапейскім рынку выглядала яшчэ больш сціпла, хоць і даволі значна. Цяпер з-за санкцый пастаўкі рэзка знізіліся, хоць і не спыніліся зусім. Усяго летась у ЕС было пастаўлена вуглевадародаў на крыху больш за 20 мільярдаў долараў. Цяпер пытанне: ці толькі расійскія газ і нафту збіраюцца замясціць Штаты? І што думаюць наконт здзелкі паміж «атлантычнымі партнёрамі» ў раёне Персідскага заліва, напрыклад у Катары? Бо менавіта ў Доху ў свой час імчаліся тыя ж нямецкія чыноўнікі падчас энергетычнага крызісу пару гадоў таму, угаворвалі катарцаў нарасціць аб'ёмы звадкаванага прыроднага газу. І што цяпер? Былыя дамоўленасці будуць ануляваныя?

Надзвычай цікавая інфармацыя засталася за кадрам: з агульнай сумай паставак усё быццам бы зразумела. А як будзе адбывацца цэнаўтварэнне? Справа ў тым, што ў Бруселя (ды і ў іншых сталіц) не было жорсткай прадузятасці супраць амерыканскай здабываючай галіны. Тут загвоздка ў іншым: у нізкай цэнавай канкурэнтаздольнасці амерыканскіх энерганосьбітаў. Сланцавая рэвалюцыя нарабіла шмат шуму, але аказалася не такой камерцыйна выгаднай, як гэта магло здацца. Вельмі высокі сабекошт рабіў тую ж нафту залежнай ад коштавай кан'юнктуры. Называліся розныя лічбы. Але ў раёне 50—60 долараў за барэль амерыканскія нафтавыя вышкі пачынаюць працаваць з блізкай да нулявой рэнтабельнасцю. Тая самая гісторыя з газам. Калі тысяча кубаметраў каштавала ў ЕС больш за 2 тысячы долараў, паліва з-за Атлантыкі з'яўлялася прахадным. Цяпер... Мяркуючы па ўсім, не. Інакш Дональду Трампу не прыйшлося б літаральна шантажом «уцюхваць» еўрапейцам свой вуглевадародны тавар.

Рызыкну выказаць здагадку: якой бы ні была формула цэнаўтварэння, яна будзе далёкая ад рынкавай. І кошт амерыканскіх нафты і газу будзе большы, чым у іншых пастаўшчыкоў. Інакш іх бы і так купілі на сусветным рынку без усялякага націску. І цяпер самае цікавае пытанне: а які механізм рэалізацыі здзелкі? Бо не старшыня Еўрапейскай камісіі Урсула фон дэр Ляен, якая вяла заключныя перагаворы з Дональдам Трампам у Шатландыі, будзе купляць энерганосьбіты! У яе грошай няма. Значыць, нейкім чынам давядзецца вырашаць гэта пытанне з энергетычнымі апаратарамі. Наўрад ці атрымаецца гэта зрабіць у добраахвотным парадку. Прыйдзецца прызначаць адказных, кантраляваць іх, караць, калі не будуць спраўляцца з набыццём неканкурэнтаздольнага амерыканскага тавару. Магчыма, давядзецца ўводзіць і квоты для іншых пастаўшчыкоў, каб расчысціць дарогу амерыканцам.

А спажыўцам? Ім таксама, відаць, давядзецца выдаваць нейкія ўстаноўкі, бо ў Еўропы з'яўляецца мэта: пераварыць амерыканскія вуглевадароды на пэўную суму. Паколькі яны дарагія, а еўрапейская прадукцыя даўно ўжо мае праблемы з цэнавай канкурэнтаздольнасцю, давядзецца ЕС дадаткова абараняцца ад знешняга свету. Але паколькі без тых жа азіяцкіх тавараў еўрапейцы цалкам абысціся не могуць, то будуць прыдумляць свае хітрыкі. І так пайшла-паехала па ланцужку сістэма квот. А яна — базіс для планавання, бо даводзіцца купляць прадукцыі не столькі, колькі трэба, а колькі прадугледжана квотай, і ад гэтай лічбы танцаваць. А менавіта так планавая эканоміка і ўладкавана. Дарэчы, гэта ж давядзецца рабіць, мяркуючы па ўсім, і амерыканцам, бо патрэбна вызначаць шчаслівчыкаў, якія будуць гандляваць нафтай і газам не на адкрытым рынку, а ў рамках пагаднення з Еўрасаюзам, на асаблівых умовах. Гэта значыць, што з іншага боку акіяна таксама з'яўляецца свой план. Прывітанне, сусветная планавая эканоміка. Аказалася, што амерыканцы не з'яўляюцца яе праціўнікамі, калі дзяржплан сядзіць у Вашынгтоне.

Дарэчы, новая нармальнасць, якая ствараецца Трампам, далёкая ад савецкіх прынцыпаў гаспадарання. Хутчэй, яна бліжэй да італьянскіх і нямецкіх канцэптаў 30—40-х. У навуковай літаратуры гэта часта называюць дзяржаўным капіталізмам. Нібыта і ёсць прыватная ўласнасць, яе ўладальнікі, захоўваюцца ўсе атрыбуты капіталізму. Але праз давядзенне планаў да прыватнікаў дзяржава гаворыць, колькі, што трэба выпускаць, па якой цане і ў які бок прадаваць. Словам, бывай рынак з яго свабодамі і хоць бы тэарэтычнымі імкненнямі да сумленнай канкурэнцыі і працвітання. У дзяржаўным капіталізме бенефіцыяры эканомікі таксама прызначаюцца. Мабыць, гэта наступны раздзел у палітычнай кар'еры Дональда Трампа.



Інтэлект ШТУЧНЫ

## Извещение о повторном открытом аукционе по продаже незавершенного строительством жилого дома и земельного участка в частную собственность в г. Гродно 26 августа 2025 года

| № лота | Местонахождение земельного участка, его кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Характеристика (описание) не завершенного строительством капитального строения | Начальная цена предмета аукциона (в том числе: начальная цена не завершенного строительством капитального строения; земельного участка), руб. | Ориентировочные расходы по подготовке документации для проведения аукциона, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Гродненская область, г. Гродно, ул. Дорожная, 2 У-364/1, микрорайон «Барановичи 5,6» 440100000003004848** | 0,1005 | Незавершенное незаконсервированное капитальное строение, степень готовности 12 %. Фундамент: блоки железобетонные; наружная площадь (площадь застройки): 127 (127) кв. м | 26 440,68 (6 953,73; 19 486,95) | 367,30 | 5 200,00 |

Целевое назначение: земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Возможность подключения к внеплощадочным сетям водоснабжения, газоснабжения, электроснабжения и пр. и точки подключения определяются проектом. Земельный участок может иметь ограничения и обременения. Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона: внесение платы за предмет аукциона; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок с момента подписания протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; продолжить строительство жилого дома в установленный срок. Победитель аукциона обязан в течение срока строительства возместить затраты на инженерную и транспортную инфраструктуру согласно индивидуально разработанному проекту в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 г. № 298 и решением Гродненского городского исполнительного комитета от 03.04.2025 № 249.

**Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», телефоны: + 375 (152) 626055, 626056.**

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в указанном размере, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 Гродненское областное управление № 400 ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, код назначения платежа 40901, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению; представить следующие документы: заявление на участие в аукционе установленной формы; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования; дополнительно представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом негосударственного юридического лица РБ – доверенность, выданная юрлицом, документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

**Аукцион состоится 26 августа 2025 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал). Прием документов, консультации и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 117 с 4 августа по 20 августа 2025 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220.

